Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца
з 9 жніўня 1917 г.

24 ЛЮТАГА 2017 г. ПЯТНІЦА № 38 (28402)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

**Чым здзівіць «Славянскі базар» сёлета**

СТАР. 3



**Сакрэты прамога эфіру**

СТАР. 5



**Праграма тэлебачання на тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Уладзімір КРАЎЦОЎ, старшыня Гродзенскага аблвыканкама:**

*«Абаронцы Айчыны — гэта не толькі салдаты, афіцэры, генералы, якія далі прысягу. Абарона сваёй Радзімы — гэта стан душы, любоў да роднай зямлі, гэта тое, што выхоўваецца з дзяцінства ў сям'і, у школе. Традыцыі патрыятызму моцныя ў Гродзенскім рэгіёне. Самае галоўнае, каб над намі заўсёды было мірнае неба».*

Курсы замежных валют, устаноўлены НБ РБ з 24.02.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,8754 | ▲ |
| Еўра | 1,9782 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0324 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0697 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

17038>

9 771990 763008

# Шэдэўр з маслабойкі




Фота БЕЛТА.

А як інакш назваць гэты пачастунак? У Глыбоцкім раёне менавіта такі вось адмыслова выраблены з масла баранчык упрыгожваў стол на вялікія святы. «Масляны баран» славуты на ўсю краіну — ён прызнаны нематэрыяльнай культурнай спадчынай Беларусі і ўнесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў. На Глыбоччыне ўнікальная традыцыя прыгатавання гэткай прыгажосці і смакаты захавалася і жыве дагэтуль дзякуючы жыхарцы вёскі Мацюкова Марыі ХРОЛ, якая пераняла гэта ўменне ад маці і бабулі. З «сыравінай» у спадарыні Марыі праблем няма: трымае на ўласным падворку тры каровы, так што свежае масла заўжды ёсць.

■ Год навукі

## СТВАРАЛЬНІКІ САРТОЎ З ЖОДЗІНА

**Год навукі абяцае быць плённым для Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па земляробстве. Яго супрацоўнікі займаюцца навуковым забеспячэннем айчынных вытворцаў аграрнай прадукцыі. А калі казаць дакладней, то гэта — стварэнне высокапрадукцыйных канкурэнтаздольных сартоў і гібрыдаў сельскагаспадарчых культур.**

— Трэба мець на ўвазе, што землі беларускія па сваіх якасных характарыстыках, бадай, самыя бедныя ў Еўропе. Каб атрымаць адпаведны ўраджай у параўнанні з Польшчай, нашым земляробам трэба дадаткова панесці ў 1,25 раза больш выдаткаў, з Германіяй — 1,5, з Францыяй — 1,8. Таму нам трэба размнажаць на новыя высокаўраджайныя сарты, гаворыць **генеральны дырэктар цэнтра доктар сельскагаспадарчых навук, прафесар, член-карэспандэнт НАН Беларусі Фёдар ПРЫВАЛАЎ.**

Фёдар Іванавіч — удалы прыклад эфектыўнага спалучэння практыкі і навукі. Патомны хлебароб, доўгі час быў старшынёй адной з найлепшых гаспадарак у Мінскай вобласці. Потым яго вылучылі на пасаду старшыні Нясвіжскага райвыканкама. Ён паспяхова спалучаў работу, як кажуць, у полі з навуковымі даследаваннямі па актуальных праблемах аграрнага сектара. Цяпер у цэнтры поўнасцю засяродзіўся на навуковых справах. Але не губляе кантактаў з земляробамі.

Гэты год абяцае быць плённым для цэнтра яшчэ і з той важнай прычыны, што вынікі папярэдняй працы дазваляюць разлічваць на новыя дасягненні ў селекцыйнай справе. Для вучоных гэта сур'ёзная нагода асэнсаваць пройдзены шлях, зрабіць высновы на будучыню. Усяго два леташнія факты: 15 сартоў цэнтра занесена ў дзяржаўны рэестр, выдадзена 13 патэнтаў на вынаходкі. Рэалізацыя плана па правядзенні Года навукі будзе спрыяць развіццю навуковай школы цэнтра. Умацоўваецца яго матэрыяльна-тэхнічная база для правядзення даследаванняў на сучасным узроўні.

СТАР. 4

■ Сацыяльны клопат

## БЕЗ ПЕРАШКОД

Даступнае асяроддзе, якасная адукацыя, магчымасць працаўладкавання, сацыяльныя менеджары для рэабілітацыі... У чым маюць патрэбу людзі з інваліднасцю?

**У студзені гэтага года праходзіла грамадскае абмеркаванне праекта Нацыянальнага плана дзеянняў па рэалізацыі Канвенцыі ААН аб правах інвалідаў. У далейшым, пасля дапрацоўкі, дакумент будзе накіраваны ва ўрад. «Звязда» таксама выслухала меркаванні зацікаўленых бакоў па гэтым пытанні.**



Фота БЕЛТА.

**Намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Аляксандр РУМАК:**

— Чалавек з інваліднасцю павінен мець магчымасць атрымліваць усе паслугі, якія атрымліваюць іншыя члены грамадства. Даступнае асяроддзе будзе развівацца комплексна. Гэта значыць, што чалавек з інваліднасцю не толькі павінен мець магчымасць выйсці на вуліцу — трэба, каб не было перашкод на ўсім яго шляху. Прычым гэта даступнае асяроддзе павінна быць забяспечана для людзей з інваліднасцю розных катэгорый — інвалідаў-калясачнікаў, невідушчых, людзей са слабым слыхам...

Не менш важна забяспечыць аказанне якасных паслуг на аб'ектах сацыяльнай інфраструктуры. Пагадзіцеся, дабрацца да аб'екта — палова справы, трэба яшчэ атрымаць тую паслугу, дзеля якой і ствараецца даступнае для інваліда асяроддзе. Таму варта распрацаваць механізм аказання сітуацыйнай дапамогі ў пераадоленні бар'ераў, якія замінаюць атрыманню інвалідамі паслуг нароўні з іншымі грамадзянамі, а таксама індывідуальных мер падтрымкі і суправаджэння ў канкрэтных сітуацыях у паўсядзённым жыцці. На маю думку, паслугі павінны быць максімальна адаптаваны да асаблівых патрэб інвалідаў.

СТАР. 2

■ Свая справа

# ДЫЯЛОГ УЛАДЫ І БІЗНЕСУ

## Ідзе актыўная работа над прапановамі ў стратэгію далейшага развіцця прадпрымальніцтва

**Асамблея дзелавых колаў, што адбудзецца ў Мінску 1 сакавіка, з'яўляецца важнай пляцоўкай для дыялогу ўлады і бізнесу, заявіла ўчора намеснік міністра эканомікі Беларусі Ірына Касцевіч. Паводле яе слоў, у Беларусі ў 2016 годзе было створана больш за 9 тысяч камерцыйных прадпрыемстваў. Таксама яна паведаміла, што адзіны рэестр адміністрацыйных працэдур павінен працаваць у нашай краіне з 1 студзеня 2018 года.**

**Старшыня прэзідыума Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва Уладзімір КАРАГІН** паведаміў, што з 24 лютага па 3 сакавіка ў Беларусі праходзіць II Тыдзень беларускага прадпрымальніцтва, падчас якога одбудзецца больш за 100 мерапрыемстваў. У прыватнасці, сёння ў Мінску адбудзецца IX Рэспубліканская студэнцкая навукова-практычная канферэнцыя «Малы і сярэдні бізнес як драйвер эканамічнага росту», а ў Оршы пройдзе круглы стол «Роля сацыяльнага прадпрымальніцтва ва ўстойлівым развіцці мясцовых супольнасцяў». На 27 лютага запланавана акцыя ў сталіцы і рэгіёнах па тэматыцы «Прадпрымальнікі пра прадпрымальніцтва». А ў Гродне адбудзецца семінар-нарада з ІП на тэму «Аб рабоце індывідуальных прадпрымальнікаў, якія ажыццяўляюць гандаль на рынках і ў гандлёвых цэнтрах. Аб выпрацоўцы прапаноў па змяненні заканадаўства па паляпшэнні ўмоў для вядзення бізнесу».

Паводле слоў Уладзіміра Карагіна, у праекце Нацыянальнай платформы бізнесу — 2017 цяпер налічваецца 86 прапаноў па шасці прыярытэтных напрамках, якія датычацца добрасумленнай канкурэнцыі, эфектыўнай дэбюракратызацыі, рэгулятарнай аптымізацыі, інстытутаў эфектыўнага развіцця і росту, пашырэння доступу да маёмасці, актываў і інвестыцый, а таксама сферы адказнага партнёрства.

**Віцэ-старшыня Мінскага сталічнага саюза прадпрымальнікаў і работадаўцаў Лілія КОВАЛЬ** адзначыла, што гэты праект распрацоўваўся на працягу 3 месяцаў. На яе думку, адрозненне цяперашняй платформы ў тым, што ў рабоце прынялі актыўны ўдзел не толькі прадпрымальнікі, але і ўлады, бо «Мінэканомікі адправіла ў каардынацыйны савет намесніка дырэктара Дэпартамента па прадпрымальніцтве Аляксандра Каліноўскага». Зборнік прапаноў па паляпшэнні дзелавога клімату «Нацыянальная платформа бізнесу Беларусі» з'яўляецца часткай прапанаваных бізнес-супольнасцю сістэмных мер па развіцці эканомікі.

У сваю чаргу член рабочай групы па стымуляванні дзелавой актыўнасці, выключэнні залішніх патрабаванняў да суб'ектаў гаспадарання, удасканаленні кантрольна-наглядннай дзейнасці, **прадпрымальнік Віктар МАРГЕЛАЎ** паведаміў, што стратэгію развіцця малога і сярэдняга прадпрымальніцтва ў тэрмін да 2030 года плануецца прадставіць грамадскасці сёлета ў сакавіку. Ён удакладніў, што адбылося два пасяджэнні рабочай групы. «Днямі адбылося першае пасяджэнне адной з падгруп у сферы гандлю, грамадскага харчавання і паслуг. На пасяджэнні апрацавана каля 40 прапаноў, якія будуць пададзеныя ў Адміністрацыю Прэзідэнта. На наступным тыдні адбудзецца чарговае пасяджэнне», — цытуе Віктара Маргелава БЕЛТА. Таксама ён адзначыў, што прадпрымальнікі актыўна працуюць над праектам Нацыянальнай платформы бізнесу — 2017. У ім у сістэмным варыянце прадстаўлена іх бачанне ключавых праблем.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■

# БЕЗ ПЕРАШКОД

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Яшчэ хачу адзначыць, што людзі з інваліднасцю таксама зацікаўлены ў пашырэнні магчымасцяў для працаўладкавання. Яны вельмі матываваныя на атрыманне дадатковага даходу да той пенсіі, якую ім выплачвае дзяржава. І тут трэба ісці ім насустрач.

**Намеснік старшыні Беларускага таварыства інвалідаў па зроку Міхаіл АНТОНЕНКА:**

— Сёння вельмі важна мець якасную адукацыю. Гэта датычыцца ўсіх, але людзей з дрэнным зрокам — асабліва. У апошнія 10 гадоў ідзе актыўнае скарачэнне працоўных месцаў з ручной працай: машыны зараз актыўна замяняюць чалавечыя рукі. І калі невідушчы чалавек атрымае якасную адукацыю, вядома ж, у той сферы, дзе зрок не адыгрывае прынцыповай ролі, ён зможа стаць канкурэнтаздольным на рынку працы, стварыць сям'ю і жыць нармальным жыццём.

Адна з праблем датычыцца таго, што ў нас пакуль не створаны ўмовы для атрымання такой адукацыі.

Мы выступаем за стварэнне роўных умоў здачы тэсціравання. Трэба, каб у інваліда быў выбар: здаваць экзамены камісіі або праходзіць на агульных падставах разам з усімі іншымі дзецьмі тэсціраванне. Інвалідам павінны быць створаны для гэтага тэхнічныя ўмовы. Напрыклад, для людзей са слабым зрокам трэба надрукаваць больш кантрасныя бланкі са знакамі вялікага памеру.

Вельмі важна таксама стварыць даступнае асяроддзе непасрэдна ў навучальных установах. Неабходна, каб для невідушчых студэнтаў з'явілася вучэбная літаратура, створаная ў даступным для іх фармаце. Мы гатовыя падказаць, што і як можна зрабіць у гэтым плане хоць бы на мінімальным узроўні, з улікам нашага няпростага эканамічнага становішча...

**Валанцёр Беларускай асацыяцыі дапамогі дзецям-інвалідам і маладым інвалідам Анастасія КАНАВАЛАВА:**

— Мы прапаноўваем увядзенне статусу «сацыяльнае прадпрыемства». Што гэта такое? Гэта камерцыйнае прадпрыемства, галоўнай мэтай якога з'яўляецца рашэнне сацыяльных праблем шляхам аказання сацыяльных паслуг альбо працаўладкавання людзей з інваліднасцю. Яшчэ мы прапаноўваем заканадаўча ўрэгуляваць пытанне з вытворчымі майстэрнямі, якія існуюць пры тэрытарыяльных цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Цяпер яны — фактычна гурткі па інтарэсах. Хацелася б, каб яны набылі пэўную самастойнасць і магчымасць удзельнічаць у гаспадарчым абароце, гэта значыць, каб людзі маглі прадаваць свае вырабы. І яшчэ адно пытанне датычыцца перагляду ўмоў аказання псіхіятрычнай дапамогі з прычыны неадпаведнасці мер прымусовага лячэння нормам Канвенцыі аб правах інвалідаў ААН.

**Старшыня Рэспубліканскай асацыяцыі інвалідаў-калясачнікаў Яўген ШАЎКО:**

— Нам бы хацелася больш цесна супрацоўнічаць з мясцовымі органамі ўлады. Справа ў тым, што наша асацыяцыя не мае баз даных людзей, якія нядаўна сталі інвалідамі-калясачнікамі. Але кожны дзень здараюцца аварыі на дарогах, з'яўляюцца ўсё новыя інваліды, і вельмі важна як мага раней пачаць дапамагаць такім людзям, каб яны не пагрузіліся ў сацыяльную апатыю, а з самага пачатку інваліднасці маглі ўключыцца ў актыўнае жыццё.

Яшчэ вельмі важнае пытанне — якасць інвалідных калясак. Павінны быць спецыяльныя дзіцячыя каляскі, а што датычыцца дарослых калясак — іх трэба падбіраць зыходзячы з параметраў кожнага канкрэтнага чалавека, а не «на вока». Гэта вельмі важна.

І яшчэ: наспела патрэба ў тым, каб органы аховы здароўя і сацыяльнай абароны працавалі ў больш цесным узаемадзеянні. Цяпер у нас няма такой пасады, як сацыяльны менеджар у рэабілітацыйным аддзяленні. Але ж чалавек, які стаў інвалідам — пасля цяжкага захворвання або аварыі, — паралельна з медыцынскай дапамогай мае патрэбу і ў сацыяльнай рэабілітацыі, нейкіх падказках, як жыць далей, улічваючы свае новыя абставіны...

**Анжаліка РАМАНЕЙКА, мама дзіцяці з інваліднасцю:**

Мой шасцігадовы сын — інвалід з дзяцінства, у яго прыроджаная паталогія зроку. Неяк мне ў выканкаме расказалі пра Беларускую асацыяцыю дапамогі дзецям-інвалідам і маладым інвалідам. Я ўступіла ў яе і такім чынам нарэшце стала камунікаваць з мамамі і дзеткамі, якія не глядзелі на нас з сынам скоса: у іх таксама былі праблемы і яны разумелі, што гэта такое. А маё дзіця нарэшце адчула сябе такім жа, як усе! Зараз мы з сынам стараемся актыўна ўдзельнічаць у мерапрыемствах асацыяцыі. Хацелася б змяніць жыццё нашых дзяцей да лепшага, таму ў мяне і ў іншых мам ёсць некаторыя канкрэтныя прапановы.

Вось, напрыклад, ёсць дзеці з псіхафізічнымі парушэннямі, якія ходзяць у цэнтры карэкцыйнага развіцця. Гэта своеасаблівыя дзіцячыя садкі, у якіх створаны ўсе ўмовы для такіх малых. Але калі дзецям спаўняецца 18 гадоў, яны пераходзяць у ТЦСАН, дзе на самай справе няма ўсіх неабходных умоў менавіта для іх. І гэта наш боль. Для гэтых дарослых ужо дзяцей трэба было б стварыць нешта накшталт такога ж дзіцячага садка, які яны маглі б наведваць пасля 18 гадоў, дзе быў бы медработнік і г.д.

Яшчэ вельмі хацелася б, каб больш шырока ўкаранялася суправаджаемае пражыванне для маладых інвалідаў з псіхафізічнымі парушэннямі. Таму што, калі такіх маладых людзей навучыць нейкім бытавым і сацыяльным навыкам, многія з іх змогуць жыць у далейшым самастойна.

І яшчэ адна балючая праблема. Дапусцім, жыве мама з дзіцем з псіхафізічнымі парушэннямі, якому ўжо споўнілася 18 гадоў. І калі яна, не дай бог, раптам трапіць у бальніцу — куды дзець на гэты час дзіця? У нас ёсць такая паслуга, як сацыяльная перадышка, але, я думаю, яе варта практыкаваць больш шырока. Ды і не ўсякая мама можа выкарыстаць яе з-за аплаты: льготы пасля таго, як дзіцяці споўнілася 18 гадоў, ужо знятыя, таму матэрыяльнае становішча такіх мам нярэдка вымушае жадаць лепшага. Гэта таксама трэба было б неяк улічваць...

**Святлана БУСЬКО.** *busko@zviazda.by*

■ Знешняя палітыка

# Імпульс для кантактаў

**Дзень Беларусі на «ЭКСПА-2017» у Казахстане запланаваны ў жніўні з удзелам кіраўніцтва ўрада. Пра гэта паведаміў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Казахстана ў Беларусі Ергалі Булегенаў на прэс-канферэнцыі.**

Дыпламат расказаў, што падрыхтоўка да гэтага маштабнага сусветнага форуму ўжо знаходзіцца на заключнай стадыі. Галоўная тэма сустрэчы, удзел у якой пацвердзілі многія дзяржавы, — энергія будучыні. Беларусі выдзелены адзін з цэнтральных павільёнаў.

«ЭКСПА-2017» адкрыецца 10 чэрвеня, працаваць будзе да 10 верасня. Кожная з краін-удзельніц прадставіць свой найлепшы вопыт па тэматыцы выстаўкі. Прадстаўнік Казахстана перакананы, што дадзеная экспазіцыя стане добрым імпульсам для далейшага развіцця беларуска-казахстанскіх кантактаў. Ён запрасіў беларусаў наведаць «ЭКСПА», пазнаёміцца з Казахстанам і дасягненнямі краін-удзельніц выстаўкі.

Адказваючы на пытанне адносна рэалізацыі сумесных праектаў у Беларусі, дыпламат сказаў, што іх пакуль няшмат. Ён акцэнтаваў увагу на тым, што буйныя сумесныя праекты Казахстан з Беларуссю, як правіла, ажыццяўляюць на казахстанскай тэрыторыі.

Што да двухбаковага тавараабароту, то, паводле яго слоў, 90% — гэта беларускія пастаўкі ў Казахстан. І толькі 10% прыпадае на казахстанскія тавары, якія прадаюцца ў Беларусь.

— *Гэта звязана з тым, што беларускі рынак насычаны, ёсць шмат вытворчасцяў. А рынак Казахстана — велізарны,* — растлумачыў дыпламат.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### АПЕК зафіксавала пачатак зніжэння сусветных запасаў нафты



Складскія запасы нафты ў развітых краінах і ў свеце ў цэлым пачалі зніжацца дзякуючы пагадненню, заявіў, выступаючы на сесіі канферэнцыі IP Week у Лондане, міністр энергетыкі Катара Махамед бен Салех аль-Сада. Як вядома, летась у лістападзе на саміце АПЕК у Вене было прынята рашэнне картэля скараціць здабычу нафты да ўзроўню 32,5 млн бараляў у суткі. Рост попыту на нафту паскорыўся. Калі ў мінулым годзе попыт павялічваўся на 1,2 млн бараляў у суткі, то сёлета рост перавысіў 1,4 млн бараляў і будзе павялічвацца, дадаў міністр энергетыкі Катара.

### Генеральны сакратар ААН прапанаваў стварыць упраўленне па барацьбе з тэрарызмам

Аб гэтым ён паведаміў на сустрэчы дзяржаў — членаў Генеральнай Асамблеі ААН. Выступаючы на нефармальным пасяджэнні па барацьбе з тэрарызмам, Антоніу Гутэрыш выступіў з ініцыятывай «стварыць новае контртэрарыстычнае ўпраўленне, якое ўзначаліць новы намеснік генеральнага сакратара». У ААН зараз існуе Контртэрарыстычны камітэт Савета Бяспекі. Структура была заснаваная СБ ААН у 2001 годзе неўзабаве пасля тэрактаў 11 верасня ў ЗША. Прапанаваная Гутэрышам структура, паводле яго слоў, не будзе курыраваць ці ўмешвацца ў працу дзеючых структур СБ ААН і будзе дакладваць Генеральнай Асамблеі ААН праз генеральнага сакратара арганізацыі.

### Жанчына ўпершыню ўзначаліла паліцыю Лондана

Новым кіраўніком Скотланд-Ярда, паліцэйскага ўпраўлення са 187-гадовай гісторыяй, прызначана Крэсіда Дзік. 56-гадовая Дзік зменіць на гэтай пасадзе Бернарда Хоган-Хоўва, які ўзначальваў сталічную паліцыю з 2011 года. Ён, у прыватнасці, гарантаваў бяспеку горада падчас Алімпійскіх гульняў — 2012. Раней Дзік займалася ў паліцыі барацьбой з тэрарызмам. Аднак у 2014 годзе, пасля 31 года службы, перайшла на працу ў Міністэрства замежных спраў. Мэр Лондана Садзік Хан назваў выбар Дзік «гістарычным рашэннем», адзначыўшы яе «выдатную кар'еру».

### Пайшоў з жыцця народны артыст Расіі Аляксей Пятрэнка



Славуты акцёр памёр на 79-м годзе жыцця. Аляксей Пятрэнка скончыў Харкаўскі тэатральны інстытут. У 1964 годзе ён пачаў працаваць у Ленінградскім тэатры імя Ленсавета (цяпер — Санкт-Пецярбургскі акадэмічны тэатр імя Ленсавета) па запрашэнні рэжысёра Ігара Уладзімірава, таксама працаваў на сцэне Маскоўскага драматычнага тэатра на Малой Броннай, МХАТа, «Школы драматычнага мастацтва» (пад кіраўніцтвам Анатоля Васільева) і «Школы сучаснай п'есы». У кіно Пятрэнка пачаў здымацца з 1967 года. Акцёр выканаў дзясяткі адметных роляў у кіно і тэатры.

# НАШЫ КНІГІ Ў ВІЛЬНЮСЕ

**Учора адбылося афіцыйнае адкрыццё стэнда Рэспублікі Беларусь на 18-й міжнароднай Вільнюскай кніжнай выстаўцы-кірмашы.**




У прэзентацыі стэнда прынялі ўдзел намеснік міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Аляксандр Карлюкевіч, супрацоўнікі пасольства Рэспублікі Беларусь у Літоўскай Рэспубліцы — саветнік-Пасланнік Людміла Татарыновіч і саветнік па пытаннях культуры Вольга Дашыневіч. З прывітальным словам выступіў вядомы літоўскі празаік і публіцыст Вітаўтас Жэймантас.

Нашу краіну на выстаўцы прадстаўляюць кнігагандлёвая арганізацыя «Белкніга» і музей «Замкавы комплекс «Мір». На беларускім стэндзе можна азнаёміцца з кнігамі, якія выйшлі ў дзяржаўных выдавецтвах «Мастацкая літаратура», «Выдавецкі дом «Звязда», «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі», «Беларусь», «Народная асвета» і іншых і прысвечаны Францыску Скарыну і 500-годдзю беларускага кнігадрукавання.

**Анастасія БАРАНОЎСКАЯ.**

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

| ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 | | | |
| **Продавец** | ОАО «МЗОР», г. Минск, ул. Октябрьская, 16. | | | |
| **ЛОТ №1** | | | | |
| **Наименование** | **Назначение** | **Общая площадь** | **Инвентарный номер** | **Адрес** |
| Б 3/к Административно-бытовой корпус | Здание многофункциональное | 702,8 кв. м | 500/С-45993 | г. Минск, ул. Октябрьская, 16 |
| **Начальная цена с учетом НДС 20%** | **1 242 686,40 бел.руб. Снижена на 20%** | | | |
| **ЛОТ №2** | | | | |
| Г 1/к Производственный корпус | Здание многофункциональное | 4157,2 кв. м | 500/С-45994 | г. Минск, ул. Октябрьская, 16 |
| **Начальная цена с НДС 20%** | **3 073 188,48 бел.руб. Снижена на 20%** | | | |
| **ЛОТ №3** | | | | |
| Д 1/к Производственный корпус | Здание многофункциональное | 1115 кв. м | 500/С-45995 | г. Минск, ул. Октябрьская, 16 |
| **Начальная цена с НДС 20%** | **1 228 488,00 бел.руб. Снижена на 20%** | | | |
| **ЛОТ №4** | | | | |
| Ж 1/к Производственный корпус | Здание многофункциональное | 886,1 кв. м | 500/С-45996 | г. Минск, ул. Октябрьская, 16 |
| **Начальная цена с НДС 20%** | **1 082 056,32 бел.руб. Снижена на 20%** | | | |

**Сведения о земельном участке**:

**Кадастровый номер:** 500000000003004776. Адрес: г. Минск, ул. Октябрьская, 16. **Площадь (га): 1,7466. Категория:** земли промышленности, транспорта, связи, энергетики, обороны и иного назначения. **Целевое назначение:** эксплуатация и обслуживание зданий многофункциональных по ул. Октябрьской, 16, зданий специализированных иного назначения по ул. Октябрьской, 16, 16/6, 16/7. **Вид права:** предоставлен продавцу на праве аренды по 31.03.2026. Земельный участок является неделимым и будет предоставлен покупателям в общую долевую аренду. **Обременения (ограничения):** водоохранная зона рек и водоемов, площадь 1,7466 га; охранная зона линий связи и радиофикации, площадь 0,0446 га; охранная зона электрических сетей, площадь 0,0065 га; охранная зона объектов газораспределительной системы, площадь 0,0204 га; зона охраны недвижимых материальных историко-культурных ценностей, площадь 0,8318 га

**Условие аукциона:** дальнейшее использование объектов недвижимости, являющихся предметом аукциона, новым собственником должно производиться в соответствии с утвержденным проектом детальной планировки, разработанным в соответствии с генеральным планом г. Минска. Предметы аукциона являются историко-культурной ценностью. При приобретении права собственности на материальную историко-культурную ценность новый собственник (владелец) этой историко-культурной ценности обязан в течение одного месяца подписать охранное обязательство по форме, установленной Министерством культуры Республики Беларусь. Невыполнение этого условия влечет за собой признание такой сделки недействительной

**Обременения:** объекты недвижимости обременены договорами залога (ипотека, правообладатель ОАО «БПС-Сбербанк») и договорами аренды. Более подробную информацию по арендаторам можно узнать у организатора аукциона и Продавца

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с № **3012343260010**; нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – **3012743260072**; в евро (EUR) – **3012343265060**; в российских рублях (RUB) – **3012743260098**; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15 (пятнадцать)** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 07.02.2017

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **WWW.CPO.BY**

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата, место и время проведения аукциона** | **15.03.2017** в 12.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата, место и время окончания приема документов** | **13.03.2017** до 17 ч.00 мин по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71; +375 29- 317-95-42. Email: auction@cpo.by** |
| **Сайт организатора аукциона** | **WWW.CPO.BY** |


## ■ Фэсты

# «БАЗАР» ЗДЗІВІЦЬ ІЗНОЎ

**XXVI Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» будзе не меней разнастайны і насычаны падзеямі, чым мінулы. Афіцыйна ён пройдзе з 13 па 17 ліпеня. Сёлета юбілей у дзіцячага конкурсу «базару»: адбудзецца 15-ты раз!**

Улічваючы, што фэст №1 на прасторах былога СССР даўно стаў заслужана «народным», арганізатары стараюцца, каб «дэмакратычным» быў кошт білетаў. У прыватнасці, плата за задавальненне ўбачыць некаторыя праекты на ўзроўні пазамінулага года. Што цікава, па традыцыі самыя дарагія білеты купляюць у першую чаргу.

— Як заўсёды, да пачатку фестывалю і пасля скančэння адбудуцца канцэрты. Сёлета: 11—12 і 18—19 ліпеня, — расказвае **кіраўнік дырэкцыі Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску», прэзідэнт Сусветнай асацыяцыі фестываляў Аляксандр СІДАРЭНКА.**

Пачаўся першы этап продажу білетаў на канцэрты: урачыстага адкрыцця і закрыцця, другога дня фіналу XXVI Міжнароднага конкурсу выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск». Як і на сольныя канцэрты: Рыгора Лепса, Стаса Міхайлава, Валерыя Меладзэ, Рыгора Крыда, гурта «Руки вверх», сатырычнага шоу «Аднойчы ў Расіі», гурта «Сплин».

З 20 лютага білеты можна набыць не толькі ў Віцебску, але і на www.ticketpro.by і www.kvitki.by.

Адрозненне чарговага фестывалю ў тым, што пераможцаў XV Міжнароднага дзіцячага музычнага конкурсу «Віцебск» вызначаць да цырымоніі афіцыйнага адкрыцця «базару». І віншаванне запланавана арганізаваць на сцэне Летняга амфітэатра. Ужо другі год запар у конкурсе прымуць удзел па адным прадстаўніку ад краін-заснавальніц фэсту: Беларусі, Украіны і Расіі.

Па-ранейшаму ў цэнтры ўвагі конкурс маладых спевакоў. У паўфінале яны выканаюць «нацыянальны хіт» (папулярныя песні краін-удзельніц конкурсу на мовах гэтых краін). У першы дзень фіналу — «славянскі хіт» (песні славянскіх аўтараў на славянскіх мовах у суправаджэнні аркестра). А ў другі дзень фіналу — песні на свой выбар з ліку вядомых усім хітоў. Узнагароджанне пераможцаў можна будзе ўбачыць на цырымоніі закрыцця фестывалю.

Сёлета дырэкцыя ўводзіць новую паслугу для прыхільнікаў згаданага вышэй конкурсу — абанемент на ўсе падзеі. Ён дае права наведвання трох мерапрыемстваў.

А на ўсе праекты фестывалю можна набыць падарункавыя сертыфікаты наміналам 10, 20, 30, 50 і 100 рублёў. Гэта можна зрабіць і праз інтэрнэт. Абмяняць іх на білеты можна ў касах Віцебска, Гомеля і Мінска па 19 ліпеня (уключна).

Па добрай традыцыі падчас «базару» адбудуцца Дзень моладзі, канцэрт у рамках Дня Саюзнай дзяржавы, праекты: «Лялечны квартал», «Тэатральныя сустрэчы»...

У гэтым годзе трэці раз арганізуюць фэст вулічнага мастацтва «На сямі вятрах», дзе можна будзе ўбачыць інтэрактыўныя выступленні вулічных тэатраў, музыкантаў, перформераў, лялечных тэатраў і артыстаў.

Працягваючы традыцыю супрацоўніцтва з фестывалямі розных краін, плануецца правесці III Міжнародную канферэнцыю «Фестывальны рух. Традыцыі і інавацыі». На яе запросяць арганізатараў фестываляў. Арганізуюць і пасяджэнне савета Сусветнай асацыяцыі фестываляў (САФ).

«Базар» — гэта месца, куды хочацца вяртацца зноў. На думку кіраўніка дырэкцыі, адмена віз для замежнікаў паспрыяе павелічэнню колькасці турыстаў з іншых краін. Фестываль можа стаць такім жа брэндам, як славуты бразільскі карнавал. Уявіце сабе: толькі на галоўнай фестывальнай пляцоўцы — у Летнім амфітэатры — плануецца правесці 17 канцэртных праграм. У тым ліку дзве начныя. Агульную колькасць мерапрыемстваў складана падлічыць.

Віцебск падчас насычанага фестывальнага марафону толькі некалькі часоў адпачывае ад падзей. Амаль што круглыя суткі тут працуюць кірмашы, спяваюць, танцуюць...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

## ■ Гучная справа

# «ЯГО ЗАМКНЁНАСЦЬ МЯНЕ ПУЖАЛА»

**Мінскі гарадскі суд працягвае разглядаць гучную справу па забойстве бензапілой у гандлёвым цэнтры «Еўропа». Учора пасля абеду на допыт былі выкліканы бацькі Казакевіча. Маці Улада, Вольга, зграбная бландынка з ціхім голасам, запэўнівала, што ў яе з сынам заўсёды былі добрыя адносіны.**

— Ён быў паслухмяным з дзяцінства, займаўся спортам, добра вучыўся. Падстаў да канфліктаў не даваў, — расказала яна. Па словах Вольгі, Уладзіслаў ніколі не жыў адзін.

— 7 сакавіка 2014 года я выйшла замуж *(за грамадзяніна Германіі, з бацькам Казакевіча яна даўно ў разводзе. —* **Аўт.**). Калі і з'язджала, магла толькі на тыдзень яго пакінуць. Ён заўсёды мог пра сябе паклапаціцца. Умеў прыгатаваць усё, што любіць з ежы.

Вольга ўспамінае, што самы цяжкі перыяд для яе быў — пасля шпіталізацыі Улада ў Навінкі: «Для мяне было шокам, калі я даведалася, што гэта была чацвёртая спроба самагубства... Пасля гэтага сын стаў замкнёным. Замкнёнасць мяне вельмі пужала. Але я заўсёды лічыла гэта асаблівасцю яго характару».

— Ці высветлілі вы прычыны спроб суіцыду сына? — спытаў дзяржаўны абвінаваўца ў маці Казакевіча.

— Не высветліла. Я як ні пыталася, Улад казаў: «Усё добра. Было і прайшло. Не хвалюйся». Я хадзіла кожны дзень да сына ў бальніцу, але гэта яго раздражняла. Я старалася мякка з ім размаўляць. Ніколі нічога ад яго не патрабавала.

Пасля лячэння ў Навінках Казакевіч перайшоў у іншую школу. Так зрабіць яго маці раілі псіхолагі, святар. «У гімназіі думалі, што мы хацелі на больш лёгкую праграму перавесціся. Але мы толькі хацелі, каб Уладу было лепш», — успамінае Вольга. Калі на пачатку мінулага года жанчына даведалася, што сын можа зняцца з уліку ў псіхіятрычным дыспансеры, яна была рада. «Усе шарахаліся ад мяне: як гэта ў цябе сын стаіць на ўліку? Я ж не ведала, што маё дзіця хворае!» Застацца ў судзе і паслухаць працэс маці не захацела. Бацька Казакевіча Валянцін успамінае: пра тое, што сын хоча скончыць жыццё самагубствам, даведаўся ад класнага кіраўніка. «Яна патэлефанавала 9 кастрычніка (2014-га. — **Аўт.**) і сказала, што атрымала ад Улада вельмі дзіўную эсэмэску. Я адразу пазваніў у міліцыю ці МНС, не памятаю, паведаміў гэту інфармацыю. Назваў нумар сына і папрасіў устанавіць яго месцазнаходжанне», — расказаў Валянцін. Бацька падлетка вырашыў для сябе, што прычына суіцыду была ў канфлікце з класным кіраўніком.

— У іх былі няпростыя адносіны. Псіхалагічная несумяшчальнасць, — растлумачыў ён.

— Вы ведаеце, чаму ваш сын зняўся з уліку? — пацікавіўся дзяржаўны абвінаваўца.

— У дыспансер мы ездзілі «для галачкі». Зайшлі на 10 хвілін, адзначыліся, выйшлі. Нічога не адбывалася. Навошта тады стаяць на ўліку? — адказаў Валянцін. Незадоўга да трагедыі ў ГЦ «Еўропа» Улад патэлефанаваў бацьку. Падлетак быў у добрым настроі.

— «А як тая шведская марка тваёй пілы называецца?» — спытаў ён. Я назваў. «А што?» — пацікавіўся я. Ён: «Нічога. У мяне ёсць адна ідэя». Кажу сыну: «Прыходзь да мяне ў гараж, патрэніруешся пілой карыстацца, у мяне пні ёсць. Я падумаў, у яго з'явілася цяга да ручной працы...»

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*


**ОБЪЯВЛЕНИЕ**
о торгах

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества и его стоимость | Лот №1 Автомобиль MERCEDES-BENZ ATEGO 1222L, год выпуска – 2012, цвет: черный, VIN №WDB9702551 L684077, стоимостью 95 855,00 рублей. |
| Собственник (владелец) имущества | ЧТУП «ВитКаскадСтрой» (УНН 390497664) |
| Наличие обременений | Декрет Президента Республики Беларусь №6 от 07.05.2012 г. |
| Местонахождение (адрес) имущества | г. Витебск, ул. С. Панковой, 3 |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | 09.03.2017 в 12.00 г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 1.3 |
| Справочная информация об организаторе торгов | Управление принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома (г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1 www.vitebskjust.gov.by) Судебный исполнитель – Ткаченко Сергей Владимирович, тел./факс: (80212) 610421, (8033) 6879148. |
| Условия и порядок проведения торгов | Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано: 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет управления принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома №3642903001037 в ф-ле 200 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300002505, не позднее 15.00 07.03.2017 г. Минимальная величина первого шага – 5% от первоначальной стоимости лота. В соответствии с частью 3 статьи 401 Хозяйственного процессуального кодекса Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется покупателем имущества |


## ■ Надвор'е

# Можа, гэта вясна?

### Сіноптыкі абяцаюць, што на наступным тыдні да нас зноў вернецца цяпло



**А ў гэтыя выхадныя ў Беларусі чакаюцца кароткачасовыя ападкі, а ўначы невялікія замаразкі, паведамляе намеснік начальніка службы метэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Святлана РЫБАКОВА.**

Сёння ў краіне будзе ісці мокры снег і дождж, а на асобных участках дарог магчыма галалёдзіца. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе 1—7 цяпла, а па поўдні — да плюс 10 градусаў. Ужо ў суботу чакаецца пахаладанне, бо ўслед за атмасферным фронтам на тэрыторыю краіны распаўсюдзяцца больш халодныя і няўстойлівыя паветраныя масы з боку поўначы Еўропы. Тэмпературны фон панізіцца, але ўсё роўна застанецца вышэйшым за кліматычную норму другой паловы лютага. Пройдзе кароткачасовы снег і падмарозіць, уначы тэмпература паветра панізіцца да мінус 1—7 градусаў, а ўдзень будзе ад 3 марозу да 3 цяпла. Па паўночнай частцы краіны захаваецца моцны парывісты вецер. У нядзелю ўначы ў паўночна-ўсходніх і заходніх раёнах пройдзе кароткачасовы снег, тэмпература панізіцца да 1—8 марозу. Раніцай і ўдзень пад уплывам чарговай сістэмы атмасферных франтоў, якія перамяшчаюцца з Заходняй Еўропы, на большай частцы тэрыторыі Беларусі чакаюцца кароткачасовыя ападкі (мокры снег, які будзе пераходзіць у дождж), слабы галалёд, на асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ўдзень складзе ад мінус 2 да плюс 5 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, у панядзелак надвор'ем пачнуць кіраваць вільготныя і больш цёплыя паветраныя масы. Уначы на большай частцы тэрыторыі, а ўдзень — у паўночна-ўсходніх і паўднёва-заходніх раёнах краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі (мокры снег, дождж). Месцамі чакаецца слабы туман і галалёд, на асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 2 градусаў да 3 цяпла, удзень — плюс 1—6 градусаў, па паўднёвым захадзе — да 8 цяпла. Сіноптыкі прагназуюць, што ў аўторак і сераду ў Беларусі будуць гаспадарыць вельмі цёплыя паветраныя масы, якія рухаюцца з боку паўднёвага захаду Еўропы. Чакаецца, што ў аўторак будзе пераважна без ападкаў, толькі ў паўночна-заходніх раёнах краіны пройдуць невялікія дажджы. Чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 1 да плюс 5 градусаў, удзень — 2—8 цяпла, а па поўдні — да плюс 10 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

# СТВАРАЛЬНІКІ САРТОЎ З ЖОДЗІНА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Створаны генетычны банк, без якога сучасная селекцыя ўвогуле немагчымая. Пабудавана лінія сушкі насення, узводзіцца корпус насенняводства. Нядаўна тут прайшоў Дзень адчыненых дзвярэй. Госці, а гэта былі пераважна маладыя людзі, школьнікі старэйшых класаў, наведалі аддзел біяхіміі і біятэхналогіі, агледзелі найноўшае абсталяванне і ўбачылі на сваё вочы, як працуе навуковая лабараторыя. Ім таксама паказалі Нацыянальны банк генетычных рэсурсаў раслін, у якім знаходзіцца калекцыйны матэрыял раслін.



У цэнтра шмат замежных партнёраў-селекцыянераў не толькі з бліжняга замежжа, але і з іншых кантынентаў.

— Мы супрацоўнічаем з навукоўцамі Расіі, Украіны, іншых краін СНД, а таксама Германіі, Польшчы, Швейцарыі, Балгарыі, Даніі. Праводзім сумесныя даследаванні, абменьваемся навуковай інфармацыяй, селекцыйнымі матэрыяламі. За межамі Беларусі нашы сарты і гібрыды займаюць каля трох мільёнаў гектараў. Гэта значыць, мы здольныя канкурыраваць з замежнымі сартамі насення, — гаворыць Фёдар Прывалаў.

Дарэчы, 15 сартоў цэнтра прызнаны ўнікальнымі ў Еўропе. Зараз яны размешчаны на востраве Шпіцберген на захоўванне ў планетарным сховішчы насення Зямлі. Нагадаем, Сусветны банк пасадкавага матэрыялу створаны ў 2006 годзе пад эгідай ААН для захавання ўсіх сельскагаспадарчых раслін, якія існуюць у свеце. Уласную ячэйку ў гэтым банку мае кожная краіна.

Штогод шмат замежных гасцей наведвае цэнтр. Летась сюды нават завіталі афіцыйныя дэлегацыі з Мазамбіка і кітайскай Акадэміі аграрных навук правінцыі Цзіллінь.

Ці маглі б здабыткі навукоўцаў быць больш значнымі? Так, лічыць кіраўнік цэнтра. Сістэма насенняводства ў Беларусі ў стане поўнасцю забяспечыць спажыўцоў кандыцыйным, высакаякасным насеннем. Аднак спецыялізаваныя гаспадаркі, а іх у рэспубліцы 90, маюць патрэбу ў карэнным абнаўленні матэрыяльна-тэхнічнай базы, а сама сістэма — у аптымізацыі. Гэту работу актывізавалі ў Год навукі. 5 мая ў цэнтры будзе праходзіць другі Міжнародны форум хлеба. Распрацавана праграма развіцця селекцыі і насенняводства збожжавых, зернебабовых, тэхнічных і кармавых культур. У ёй дэталёва абгрунтаваны этапы, меры, патрэбнасць у тэхнічных сродках, неабходныя структурныя і арганізацыйныя змены ў сістэме насенняводства.

Гэты Год навукі для цэнтра асаблівы яшчэ і таму, што ў ліпені яго калектыў будзе адзначаць 90-годдзе з дня заснавання. За гэты час ён прайшоў шлях ад невялікага інстытута да навукова-практычнай установы з сусветнай вядомасцю. Прыедуць шмат замежных вучоных, спецыялістаў-практыкаў. З нагоды юбілею запланаваны шэраг мерапрыемстваў. Адно з іх: адкрыццё Алеі вучоных цэнтра, якая будзе знаходзіцца побач з будынкам інстытута ў Жодзіне. Каб нашчадкі былых і сённяшніх селекцыянераў ведалі і ганарыліся сваімі славутымі папярэднікамі.

**Леанід ТУГАРЫН.**

■ Погляд

# АБ АДНЫМ МАРШЫ...

**У невялікім польскім горадзе Гайнаўка 26 лютага павінен прайсці марш у памяць аб так званых праклятых жаўнерах, ваярах Арміі Краёвай, якія змагаліся за незалежнасць Польшчы падчас Другой сусветнай вайны, нават калі польскі ўрад загадаў злажыць зброю і не перашкаджаць савецкім войскам ісці на Берлін.**

**Здавалася б, нічога дрэннага ў гэтым няма. Палякі ўшаноўваюць сваіх герояў у сваім горадзе і маюць на гэта поўнае права, але... Вось калі б не гэта «але», якое складаецца з невялічкіх, але вельмі важных дробязяў, якія робяць гэты марш, мякка кажучы, незразумелым.**

**Мерапрыемства будзе праводзіцца ў Гайнаўцы ўжо другі раз, і мінулы марш паказаў, што гэта падзея — не свята памяці аб трагедыі вайны, а хутчэй дзень нецярпімасці, калі ўбіваюць новыя кліны паміж людзьмі і падаўжаюць ланцуг нянавісці і ўзаемных абвінавачанняў у польскім грамадстве.**

## ТРОШКІ ГІСТОРЫІ

Постаці «праклятых жаўнераў» даволі супярэчлівыя для самых палякаў, не кажучы ўжо пра нацыянальныя меншасці, якія жывуць у Польшчы і чые продкі сутыкнуліся з імі падчас Другой сусветнай вайны.

Іх шануюць за тое, што яны імкнуліся да аднаўлення незалежнасці і суверэнітэту сваёй краіны. Але пры гэтым яны імкнуліся ў крывавай барацьбе з украінцамі, літоўцамі і беларусамі захаваць за Польшчай сталіцу сучаснай Літвы — Вільнюс, а таксама ўкраінскія і беларускія землі, якія з 1921 па 1939 («ажно» 18 гадоў!) знаходзіліся ў складзе Польшчы. Гэты момант да нашага часу не дае спакою ўльтраправым нацыяналістам, дагэтуль некаторыя палякі зняважліва называюць сучасную Беларусь і Украіну «крэсамі», г. зн. «ускраінай» Польшчы.

Аднак «праклятыя жаўнеры» не проста змагаліся з нямецкімі і савецкімі арміямі. Яны таксама адзначыліся і «работай» з мясцовым насельніцтвам. Напрыклад, атрады Стаўбцоўскага злучэння Арміі Краёвай са снежня 1943 да канца чэрвеня 1944 забілі каля шасці тысяч мірнага насельніцтва на падставе іх прыналежнасці да «бальшавікоў» (на тэрыторыі, якая да 1939 года належала БССР, і да бальшавікоў на ёй можна было аднесці каго хочаце). У Лідскай акрузе з лютага па красавік 1944 года ад рук «акаўцаў» (АК) загінулі некалькі тысяч чалавек. Забойствы суправаджаліся здзекаваннямі, пагромамі і рабаваннямі.

«Праклятыя жаўнеры» каралі беларускае насельніцтва не толькі за сувязь з партызанамі, за сімпатыі да Чырвонай арміі і савецкай улады, але часам з нацыяналістычных і рэлігійных меркаванняў — таму, што гэтыя людзі не каталікі і па нацыянальнасці не палякі.

І менавіта там, дзе асабліва актыўна «праклятыя жаўнеры» змагаліся з мясцовым насельніцтвам, ужо другі раз запар збіраюцца праводзіць марш у іх гонар...

## ТРОШКІ ГЕАГРАФІІ

Гайнаўка — гэта адзін з самых усходніх гарадоў Польшчы на памежжы з Беларуссю. Паводле вынікаў перапісу насельніцтва 2002 года, у Гайнаўцы самая вялікая ўдзельная вага беларусаў сярод усіх гарадоў Польшчы, яны складаюць больш за палову насельніцтва 22-тысячнага горада.

Менавіта тут ваяваў адзін з самых вядомых «праклятых жаўнераў» — Рамульд Райс (мянушка Буры), які ажыццяўляў сапраўдныя этнічныя чысткі ў ваколіцах гэтага горада ў пачатку 1946 года. Група Бурага толькі з 30 студзеня па 2 лютага 1946 года «пакарала смерцю» 80 беларусаў, у тым ліку жанчын і дзяцей. Райс і яго салдаты расстрэльвалі людзей, секлі іх сякерамі, спальвалі, гвалтавалі дзяўчат і забівалі іх пры супраціўленні. Было шмат забойстваў у вёсках Старыя Пухалы (Puchaly Stare), Заляшаны (Zaleszany), Зане (Zanie).

Пакараны смерцю ў 1950 годзе, капітан Райс быў рэабілітаваны ў 1995 годзе судом Варшаўскай ваеннай акругі. У пастанове суда давodзіцца, што прысуд капітану Райсу адменены таму, што ён «змагаўся за незалежнасць польскай дзяржавы» і, выдаючы загады, якія датычыліся ў тым ліку «пацыфікацыі» беларускіх вёсак, дзейнічаў у сітуацыі «вышэйшай неабходнасці, якая прымушала яго выконваць азначаныя дзеянні не заўсёды этычна».

Вядома, беластоцкі філіял польскага Інстытута нацыянальнай памяці кваліфікаваў падзеі ў вёсцы Заляшаны як злачынства з прыкметамі генацыду, але менавіта з лозунгамі ў гонар памяці Бурага ў мінулым годзе ішлі ўдзельнікі першага маршу. І гэта выглядала так, нібы яны ішлі па касцях і крыві з дзяцей і ўнукаў тых, каго тут забіваў Райс са сваімі жаўнерамі.

Дык навошта менавіта тут праводзіць марш, навошта турбаваць памяць загінулых і падымаць на шчыт, мякка кажучы, неадназначную асобу? Арганізатары марша кажуць, што такім чынам яны ламаюць нібыта існуючае табу на сцвярджэнне сваёй «польскасці» і шанаванне польскіх герояў ва ўсходніх рэгіёнах краіны.

Але ці не падаецца арганізатарам, што замест гэтага ствараецца штучная падстава для падзелу горада на палякаў і беларусаў, на «патрыётаў» і «камуністаў»?

Хоць улады горада не далі дазволу на правядзенне гэтага мерапрыемства, арганізатары абяцаюць прывезці з усёй Польшчы яшчэ больш «сапраўдных патрыётаў» і правесці марш нягледзячы ні на што.

## ТРОШКІ ПАЛІТЫКІ

Дык усё ж навошта праводзіць такі марш у такім месцы і ў такі час?

На гэтае пытанне можа быць некалькі адказаў. Па-першае, гэта можа быць дэманстрацыя сілы польскіх ультраправых арганізацый, якія жадаюць правядзення больш нацыяналістычнай арыентаванай палітыкі ад кіруючай праваканасерватыўнай партыі «Права і Справядлівасць». Па-другое, праводзячы такія мерапрыемствы ва ўсходніх рэгіёнах, яны адначасова дэманструюць мясцоваму насельніцтву нявыгаднасць і небяспечнасць самаідэнтыфікацыі сябе як «не палякаў», нібы нагадваючы, што справы Райса можна і паўтарыць.

Не будзе гэта спрыяць і беларуска-польскім адносінам. Вядома, што нацыянальныя меншасці з'яўляюцца адным з лакаматываў двухбаковых кантактаў і ўзаемаразумення. Але было б дзіўна, калі б Беларусь падабалася такая дэманстрацыя «братэрскіх адносін» паміж народамі. Таксама, як і правядзенне, скажам, у Гродзенскай вобласці (ці ў любой іншай) марша ў гонар ліквідацыі жаўнераў АК вызвала б законнае абурэнне польскай грамадскасці, калі не МЗС.

У польскім грамадстве відавочна нарастаюць правыя і праваппулісцкія настроі, якія выкарыстоўваюць гісторыю ў якасці грунту для стварэння міфа пра бездакорную і гераічную польскую нацыю. Гэтыя міфы прываблівaюць палякаў марай пра вялікую і моцную краіну, якая з'яўляецца моцным гульцом на еўрапейскай і сусветнай арэне. І ў такіх марах няма нічога дрэннага, пакуль гэта не звязана з самасцвярджэннем за кошт іншых народаў, пошукам страчаных тэрыторый ці рэалізацыяй сваіх жыццёва важных інтарэсаў праз ініцыяванне канфліктаў з суседзямі. Мы ўсе добра памятаем, чым гэта можа скончыцца...

Трэба спадзявацца, што марш у гонар «праклятых жаўнераў» у Гайнаўцы пройдзе мірна і не справакуе мясцовае насельніцтва на сутычкі з правярадыкальнымі нацыяналістамі.

Трэба спадзявацца, што беларусы, якія спрадвеку жывуць там, не будуць паглядаць з недаверам і неразуменнем на сваіх польскіх суседзяў, нібы пытаючыся «за што?» і «навошта?», як некалі іх бацькі і дзяды пыталіся ў 1946-м.

**Антон ВАСІЛЕВІЧ** ■


## ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ
### О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ

гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в дер. Переездная (по генплану №12), дер. Лужки, ул. Банная (по генплану №2), дер. Рудня (участок №2), дер. Рудомейка (участок №2), дер. Прилепская Усяжка (участок №1) Озерицко-Слободского сельсовета Смолевичского района Минской области

| | | |
|---|---|---|
| 1 | **Форма проведения аукциона** | Открытый |
| 2 | **Дата, время и место проведения аукциона** | 30 марта 2017 г., в 11.00, аг. Слобода, ул. Красногвардейская, 27, Озерицко-Слободской сельисполком, зал заседаний |
| 3 | **Продавец и его адрес** | Озерицко-Слободской сельисполком, аг. Слобода, ул. Красногвардейская, 27 |
| 4 | **Земельный участок, его кадастровый номер и адрес** | Лот №1 – площадь 0,0771 га №624883008101000133 дер. Переездная (по г.п. №12)<br>Лот №2 – площадь 0,1347 га №624883005601000172 дер. Лужки, ул. Банная (по генплану №2)<br>Лот №3 – площадь 0,1494 га №624883008501000103 дер. Рудня (участок № 2)<br>Лот №4 – площадь 0,1500 га №624883008601000094 дер. Рудомейка (участок №2)<br>Лот №5 – площадь 0,1090 га №624883008201000111 дер. Прилепская Усяжка (участок №1) |
| 5 | **Условия продажи** | Без изменения целевого назначения |
| 6 | **Целевое назначение земельного участка** | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (10904 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) |
| 7 | **Начальная (стартовая) цена продажи** | Лот №1 – 15000,0 рублей<br>Лот №2 – 20000,0 рублей<br>Лот №3 – 6000,0 рублей<br>Лот №4 – 15000,0 рублей<br>Лот №5 – 12000 рублей |
| 8 | **Условия аукциона** | А) продажа по цене не ниже начальной<br>Б) участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории республики<br>В) без права предоставления рассрочки |
| 9 | **Наличие инженерной инфраструктуры** | дер. Переездная – подъездные пути, электричество<br>дер. Лужки, ул. Банная (гп. 2) – подъездные пути, электричество, газ<br>дер. Рудня – подъездные пути, электричество<br>дер. Рудомейка – подъездные пути, газ<br>дер. Прилепская Усяжка – подъездные пути, электричество |
| 10 | **Ограничения в использовании** | Лот 3– водоохранная зона реки и водоема |
| 11 | **Условия оплаты** | За безналичный расчет в течение 10 рабочих дней после подписания протокола по результатам проведения аукциона |
| 12 | **Сумма задатка и реквизиты продавца** | 10% от начальной (стартовой) цены земельного участка<br>р/с 3641000000614 ОАО «АСБ Беларусбанк» филиал 612 г. Борисов ЦБУ 621 г. Смолевичи УНП 600046563 МФО 153001810 (с пометкой «задаток за земельный участок») |
| 13 | **Порядок предв. озн. в натуре с земельными участками** | Среда в 10.00 |
| 14 | **Прием документов** | В рабочие дни: понедельник, вторник, среда, четверг, пятница с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 |
| 15 | **Окончательный срок приема документов** | 24 марта 2017 года в 17.00 |
| 16 | **Контактный телефон** | 8-01776-44-636, 68-030 |

Расходы по организации и проведению аукциона: лот 1 – 1669,14 бел. руб., лот 2 – 1635,60 бел. руб., лот 3 – 1450,09 бел. руб., лот 4 – 1450,65 бел. руб., лот 5 – 1595,74 и публикация информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона.

Примечания: для участия в аукционе в адрес продавца необходимо предоставить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков).

Физическим лицам – документ, удостоверяющий личность (паспорт) и копию паспорта покупателя или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально (в случае, если интересы покупателя представляет это лицо).

3.Счет в банке, на который перечисляется сумма возвращаемого задатка.

## ОАО «СТРОЙТРЕСТ №7»
### СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОЧЕРЕДНОГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ

Собрание состоится **30 марта 2017 года** в здании администрации ОАО «Стройтрест №7» (г. Минск, пр. Машерова, 16, зал заседаний) в 15.00.

Регистрация участников собрания – с 14.00 до 14.40 по месту проведения собрания

**ПОВЕСТКА ДНЯ**

1. Об итогах деятельности Общества за 2016 год и утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках Общества
2. Распределение прибыли и убытков по итогам работы Общества за 2016 год с учетом заключения ревизионной комиссии.
3. О размере и сроках выплаты дивидендов по результатам 2016 года.
4. О внесении изменений и дополнений в Устав
5. Избрание членов совета директоров и ревизионной комиссии.

Для регистрации иметь при себе следующие документы:
акционеру общества – паспорт;
представителю акционера – паспорт и доверенность. УНП 100512859

**ГУ «Гомельоблгидромет»** приглашает к участию в процедуре переговоров по выбору подрядчика для осуществления текущего ремонта пожарной сигнализации и системы оповещения о пожаре склада №1,склада №2, гаражей. Контактные телефоны: 8-0232-260350, 260683, 260392. Предложения к участию направлять с момента выхода приглашения в запечатанных конвертах по адресу: 246029, г. Гомель, ул. Карбышева, 10, ГУ Гомельоблгидромет в течение десяти дней с момента выхода приглашения. УНП 400254494

Уважаемые акционеры
## ОАО «БЕЛКОТЛООЧИСТКА»!

Очередное собрание акционеров состоится 29 марта 2017 года, начало собрания в 10.00, место проведения – г. Минск, ул. Аранская, 22а. Регистрация проводится с 9.00 до 9.45 (при себе иметь паспорт)

**ПОВЕСТКА ДНЯ**

1. Об итогах работы общества за 2016 г. и задачах на 2017 г.
2. Утверждение бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках за 2016 г., определение порядка выплаты дивидендов.
3. О направлении использования прибыли в 2017 году
4. Отчет наблюдательного совета и ревизионной комиссии о работе за 2016 г.
5. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
6. Утверждение условий вознаграждения членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

УНП 100071353 Наблюдательный совет

Мар'яна МУРАНКОВА:



# «За час праграмы ў прамым эфіры худзееш на кілаграм»

**Прамы эфір хавае для тэлевядучых шмат сюрпрызаў: можна забыцца імя героя, не ўкласціся ў час ды і ўвогуле адхіліцца ад сцэнарыя, напісанага рэдактарамі. Пра ўсе плюсы і мінусы работы «не пад лінеечку» і без чарнавіка выдатна ведае наша сённяшняя суразмоўца. Тэлевядучая Мар'яна Муранкова добра вядомая гледачам маладзёжнай праграмы «Пін_Код», якая з аўторка па пятніцу выходзіць на канале «Беларусь 2». Мы гутарым пра сакрэты прафесіі, важнасць быць сабой і вучыцца ў аўтарытэтаў.**


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

***— Мар'яна, як пачынаўся твой прафесійны шлях на тэлебачанні? Ты з дзяцінства марыла быць вядучай?***

— Я не выпадковы чалавек у прафесіі тэлевядучай. Працаваць на тэлебачанні хацела з дзяцінства, але гэта не было вялікай марай і памкненнем. Скончыла філалагічны факультэт БДУ па спецыяльнасці «руская філалогія», і ўжо ў студэнцкія гады даведалася, што магу досыць добра пісаць. Калі пачалі працаваць над курсавымі работамі, мне не хацелася сядзець у бібліятэках, і я пісала нешта ад сябе *(смяецца)*. Студэнткай 5 курса я прыйшла на адзін з кабельных каналаў проста паспрабаваць, як гэта — здымаць сюжэты, навіны. Потым працавала ў сталічным часопісе «Праменад», які выходзіў у фармаце гіда па культурнай сталіцы. Я зразумела, што расказваць пра культуру — гэта і ёсць маё жыццё, але ў нейкі момант работы ў часопісе стала мала, і я прыйшла на тэлебачанне. Спачатку разам з Алінай Краўцовай рабіла праграму «Культурныя людзі» — напэўна, адзіную, якую я глядзела штовыхадныя яшчэ з дзяцінства. Мне пашчасціла быць у камандзе з Алінай, менавіта яна расказала, як трэба працаваць. Спецыялізуюся на культуры, не раблю навіны і не працую карэспандэнтам. Таму, распавядаючы пра падзеі, усё прапускаю праз сябе, праз душу. Вось ужо 5 гадоў я на тэлебачанні, імкнуся зрабіць нешта прыгожае і цікавае. Калі ў мяне гэта атрымліваецца, то добра.

> **«Тысяча гадзін практыкаванняў над дыкцыяй нічога не вартая без харызмы. Тысяча прачытаных кніг губляюць каштоўнасць, калі не зробіш так, каб слухалі толькі цябе».**

***— Сама глядзіш тэлевізар? Праца каго з калег найбольш падабаецца, захапляе?***

— Люблю палітычныя праграмы, навіны, з задавальненнем гляджу рэпартажы пра ўсё, што тычыцца журналістыкі, грамадскага жыцця. Мне вельмі падабаецца, як працуе Уладзімір Познер, люблю шоу Опры Уінфры, якое цягам некалькіх дзесяцігоддзяў выходзіла на тэлебачанні і з'яўляецца для мяне ідэалам. З беларускіх тэлевядучых уражвае Святлана Бароўская, можна вучыцца кожны дзень, проста як я слухаючы. Мне пашчасціла з ёй працаваць у праграме «Добрай раніцы, Беларусь!», тут я рэдактар і пішу сцэнарый для Святланы. Гэта вельмі добры вопыт.

***— Ты вядучая маладзёжнай праграмы «Пін_Код». Гэта накладае адбітак на паводзіны ў эфіры і на спецыфіку работы?***

— Працуючы ў маладзёжнай праграме, ты разумееш, што з'яўляешся прыкладам. Варта сябе так паводзіць, нешта такое рабіць, каб чаму-небудзь навучыць падлеткаў, перадаць свой вопыт. Нават адзенне для эфіраў падбіраю адпаведнае. Праграма «Пін_Код» выходзіць у прамым эфіры, гэта таксама накладае адбітак на работу. Час абмежаваны, у навушніку галасы рэжысёра, рэдактара, пры гэтым трэба завяршыць кожнае інтэрв'ю так, каб яно выглядала цэльна, прыгожа, не было абарваным. Мне падаецца, за праграму ў прамым эфіры худзееш на кілаграм.

***— Чым яшчэ адметны прамы эфір?***

— Гэта не работа па сцэнарыі, дзе ўсё загадзя прадумана, прапісана, а ты проста паўтараеш. Сцэнарый для нас — толькі апора. Я так лічу. Але некаторыя вядучыя нават у прамым эфіры імкнуцца не адхіляцца ад плана, лічаць абавязковым прагаварыць усё, што напісаў рэдактар. Для мяне сцэнарый — павадыр, за якім ідзеш, але ад яго проста адштурхоўваешся, напаўняеш сваім зместам. Я не люблю працаваць пад лінеечку.

***— Свае праграмы пераглядаеш?***

— Так, каб бачыць, як працуюць калегі, як я сама працую. Паўтара года таму, калі я толькі прыйшла на праект, пераглядала кожны свой эфір, каб даведацца пра памылкі. Я вельмі самакрытычная і заўсёды сама да сябе прыдзіраюся, бачу недахопы. Нават калі мне кажуць, што ўсё было выдатна. Заўсёды трэба вучыцца, развівацца. Таму мяне здзіўляюць людзі, якія выйшлі ў эфір некалькі разоў і лічаць сябе знаўцамі, дазваляюць сабе расслабіцца.

***— А ці важна вучыцца ў калег, мець сярод іх сваіх настаўнікаў, дарадцаў?***

— У мяне ёсць аўтарытэты ў прафесіі, нават сярод калег. Іх мала, але я лічу, што такія людзі павінны быць у кожнага, калі ён хоча нечага дасягнуць. Думаю, нельга навучыцца быць тэлевядучым. Як і ў кожнай прафесіі, можна набыць толькі пэўныя навыкі, уменні. Але ў цэлым ты або можаш працаваць, або не. Тысяча гадзін практыкаванняў над дыкцыяй нічога не вартая без харызмы. Тысяча прачытаных кніг губляюць каштоўнасць, калі не зробіш так, каб слухалі толькі цябе. Таму трэба сябе напаўняць: чытаць больш кніг, глядзець больш добрых фільмаў, слухаць добрую музыку, камунікаваць з цікавымі, разумнымі людзьмі. Апошняе, напэўна, найважнейшае.

***— Але на экране трэба быць прыгожай...***

— Важны складнік поспеху на ўсім — добры, пазітыўны настрой, усмешка. Стараюся перад эфірам вызваліцца ад усялякіх думак: што б ні адбывалася ў жыцці, варта працаваць тут і цяпер для гледача, забывацца на ўсе праблемы, што маеш. Я заўважыла, нават калі баліць галава ці страўнік, то калі ўключаецца камера, усё раптам праходзіць. Мне падаецца, галоўны сакрэт — у любові да сваёй прафесіі, таго, што ты робіш. Варта любіць не сябе ў кадры, а ўсё, што цябе акружае ў рабоце. Трэба больш аддаваць, сусвет пачуе і абавязкова аддзячыць добрым гледачом. Таксама важна быць сабой. Калі маеш сваю «фішку», харызму, ты ні на каго не падобны, не стараешся за некім паўтарыць і ідзеш сваім шляхам, то раней ці пазней чагосьці дасягнеш. Хай і не адразу.

***— Можаш прыгадаць смешныя выпадкі, што здараліся падчас эфіраў?***

— Ды яны ўвесь час адбываюцца! Часцей за ўсё звязаныя з тым, што мы з калегамі часам забываем тэкст. Калі вы бачыце, што вядучыя раз-пораз перакідваюць «павады» гутаркі паміж сабой, значыць нехта з іх забыўся. Аднойчы я забылася, як завуць госця. А Віталік Карпанаў, мой калега, неяк забыўся, як правільна па-англійску гучыць назва гурта. Таму кожны раз падводзіў рэпліку так, што яго называла я. Вядучы — прафесія, дзе многае ад цябе не залежыць. Глядач бачыць, як ты загрыміраваны, якая ў цябе прычоска, як ты апрануты, што кажаш. Усе думаюць, што гэта і ёсць ты. Але ж насамрэч усё залежыць ад добрага грымёра, стыліста, рэдактара, рэжысёра, правільна пастаўленага святла.

***— Камфортна адчуваеш сябе ў калектыве?***

— Мне вельмі падабаецца калектыў Белтэлерадыёкампаніі. Люблю сваіх калег. Уяўляеш, усе працуюць у прамым эфіры, усе на стрэсе, на нервах, але ў той жа час умеюць захоўваць спакой, усміхацца. Мы многа ўсміхаемся, жартуем, сябруем, падтрымліваем адно аднаго, дапамагаем. Ніхто не цягне коўдру на сябе, а гэта вельмі важна.

***— У журналістаў ёсць адна адметнасць: нам вельмі складана «адключыцца» ад працы і сапраўды адпачываць.***

— Так, гэта вельмі складана. Зранку прачынаюся і ліхаманкава ўспамінаю, што варта зрабіць у кожным з праектаў. Каб працаваць на тэлебачанні, трэба быць сапраўдным працаголікам. Не кожны зможа цалкам прысвяціць сябе прафесіі, на другім плане пакінуць асабістае жыццё. Таму і адпачываю я таксама ў працэсе работы. Мне для адпачынку шмат не трэба. Калі доўга адпачываю, пачынаю сумаваць.

***— Ты ўжо адзначала, што маеш філалагічную адукацыю. Але каб быць вядучай, гэтага не зусім дастаткова. Можа, наведвала дыктарскія курсы?***

— Я доўгі час прафесійна спявала, займалася акадэмічным, джазавым вакалам. Гэта ж таксама ўплывае і на дыкцыю, і на паводзіны. Гэта ж праца з дыяфрагмай, правільная пастаноўка голасу. Не было такога, што я рэзка стала тэлевядучай, да справы я ішла фактычна ўсё жыццё, з дзяцінства: хадзіла ў тэатральную студыю, займалася музыкай, хадзіла ў мастацкую школу. Гэта ж таксама ўплывае: развівае густ, дапамагае будаваць сюжэт.

***— Марыш стварыць свой аўтарскі праект? Якой тэме ён быў бы прысвечаны?***

— Усё павінна адбывацца ў свой час. На тэлебачанні працую не так доўга, толькі 5 гадоў. У мяне няма любімых тэм, любая тэма любімая. Кожную праграму трэба рабіць яскрава, цікавай, усміхацца і несці добры настрой гледачам.

Марына **ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*




## Аўторак, 28 лютага

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.10** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.35** Зона Х.
**9.10, 22.00 Серыял «След».*****
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00, 20.00 Серыял «Практыка».***
**12.10, 16.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».*****
**13.20** Дзень у вялікім горадзе.
**14.20** Дзіцячы доктар.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «Закаханыя жанчыны». 1-я серыя.*****
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20, 23.50** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.40** Спецыяльны рэпартаж.
**0.25** Дзень спорту.
**0.40 Серыял «Другое паўстанне Спартака».*****

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 22.30** Тэлебарометр.
**9.05, 18.30 Серыял «Апошні з Магікян». 1—2-я серыі.*****
**10.10, 17.05 Дэтэктыў «Такая работа».*****
**11.00, 16.15 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».***
**11.50, 22.35 Серыял «Шурачка».***
**12.20, 19.35** «Тата папаў». Сямейнае рэаліці-шоу.
**14.15, 21.20, 22.05** «Паненка-сялянка». Рэаліці-шоу.
**15.20, 23.05** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**16.05** Горад.
**17.55** «Пра ежу».
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**23.50** «Анлайн. Па-за сеткай». Скетчкам.

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35** «Беларуская кухня». Капусны суп з крапівой. Капуснікі.
**8.00, 12.00, 20.20** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 18.40 «Ясенін». Драма. 1-я серыя.*****
**9.15, 13.50 «Усё, што нам трэба...» Меладрама. 1—2-я серыі.***
**11.00** «Гітара па крузе».
**12.15** «Наперад у мінулае».
**12.40** М/ф.0
**12.45, 23.55** «Дыя@блог». Пра вечнае.
**13.15** «Подых струн».
**15.40, 21.05** «Ледзяное неба». Дак. фільм. 2-я серыя.*
**16.15, 21.40 «Сакрэтны фарватар». Маст. фільм. 1—2-я серыі.***
**19.30** «Ваша лато», «Пяцёрачка».
**20.00** «Выйсце ёсць». Мікалай Чаргінец.
**20.40** «Калыханка».

### Беларусь 5

**8.00** PRO спорт. Вынікі тыдня.
**8.40** Лёгкая атлетыка. Міжнародны турнір.
**10.20** Хакей. КХЛ. Заходняя канферэнцыя. 1/4 фіналу. Чацвёрты матч. «Дынама-Мінск» — «Лакаматыў».
**12.15** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. Першы матч. «Баер» (Германія) — «Атлетыка» (Мадрыд, Іспанія).
**14.10** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. Першыя матчы. Агляд.
**14.40** Біятлон. Маладзёжны чэмпіянат свету. Гонка праследу. Юніёры.
**15.30** Біятлон. Маладзёжны чэмпіянат свету. Гонка праследу. Юніёркі.
**16.20** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.
**16.50** Хакей. КХЛ. Усходняя канферэнцыя. 1/4 фіналу. Чацвёрты матч. «Салават Юлаеў» — «Ак Барс». (У перапынках — PRO спорт. Навіны.)
**19.20** Міні-футбол. Чэмпіянат Беларусі. «Сталіца» (Мінск) — «УУС Дынама» (Гродна). (У перапынку — PRO спорт. Навіны.)
**21.10** Спорт-кадр.
**21.40** Змешаныя адзінаборствы. Кубак Беларусі.

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Навіны.
**6.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здарова!»
**10.20** «Смак».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.10** «Сам-насам з усімі».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.15, 16.20** «Час пакажа».
**16.55** «Давай пажэнімся!»
**18.20 Серыял «Татавы дочкі».**
**18.55** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Грачанка».**
**23.00** «На кончыках пальцаў».
**0.10** «Вячэрні Ургант».
**0.50** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.25** «Тайны Чапман».
**9.25** «Усім па катку».
**9.35, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**10.45, 0.20 «Знахар». Серыял.**
**12.35, 17.35** «Званая вячэра».
**13.50 Маст. фільм «Шарада».***
**16.00 «Следакі». Серыял.**
**16.50** «Цэнтральны рэгіён».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Тэрыторыя памылак».
**22.00** «Глядзець усім!»
**23.05** «Аўтапанарама».

### МІР

**6.20 М/ф «Машыны казкі».0**
**7.30** Добрай раніцы, свет!*
**9.00, 1.05 Маст. фільм «Мэта жыцця».***
**12.30** «Цяжар абеду».*
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** «Няма праблем!»***
**14.55** Дак. фільм «Сямейныя драмы».***
**16.15 Серыял «Вяртанне Мухтара».*****
**19.20, 4.25 Серыял «Закон і парадак».*****
**22.10 Маст. фільм «Я Вас чакаю».*****
**23.45 Серыял «Спрут».*****

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Пакой смеху».
**12.00** «60 хвілін». Ток-шоу.
**13.15** «Правілы жыцця».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.40** «Прамы эфір».
**17.20 Серыял «Веранiка. Страчанае шчасце».**
**19.15, 20.40 Серыял «Пошукі доказаў».**
**21.40** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**22.00, 23.10 Серыял «Кацярына. Узлёт».**
**0.05** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

**05.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10** «Таямнічая Расія».***
**7.10, 8.05 Серыял «Адвакат».*****
**9.00 Серыял «Вяртанне Мухтара».*****
**9.45, 23.10** «НЗ.by».
**10.25 Серыял «Пчаляр».*****
**12.05** Суд прысяжных.
**13.25, 16.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05 Серыял «Патруль».*****
**17.00 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».*****
**18.00** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.40 Серыял «Сэрца анёла».*****
**21.30 Серыял «Настаўнік у законе. Схватка».*****
**23.30** «Рэвалюцыя live».

### 8 канал

**7.00** Раніца на «Восьмым».
**10.30** «Мой любімы гадавanец».
**11.00 Дэтэктыў «Дзесяць негрыцянят».**
**13.10 Серыял «Блізняты».**
**14.00 Прыгоды «Парк Юрскага перыяду».**
**16.00, 19.20, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**16.05 «Мультпарад». «Кот Апакаліпсіса».**
**17.45 Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».**
**18.30 Серыял «Канвой «PQ-17».**
**19.25 Серыял «Выкрадзеныя».**
**20.50** «Вечарніца». «Кацяня па імені Гаў».
**21.05** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.20 Трылер «Абрабаванне па-італьянску».**
**23.10 Серыял «Амерыканская гісторыя жахаў».**

### ВТБ

**6.00** «Турбаміксер».
**7.00** М/ф «Тры каты».
**7.05** М/ф «Смяшарыкі».
**7.35** М/ф «Маша і Мядзведзь».
**7.45** М/ф «Машыны казкі».
**7.50** М/ф «Фіксікі».
**8.00** «Ералаш».
**8.30, 16.50** Серыял «Варонiны».
**9.30** Баявік «Куленепрабівальны».
**11.40, 1.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**12.00, 5.00** Серыял «Сакратар».
**13.00** «Паспець за 24 гадзіны».
**14.00, 19.20** Серыял «Мамачкі».
**15.10, 00.30** Серыял «Маладзёжка».
**16.20** Серыял «Сям'я 3D».
**18.00** «Уральскія пельмені».
**20.20** Серыял «Закрытая школа».
**21.30** Драма «128 ударaў сэрца ў хвіліну».
**23.30** Серыял «Месяц».
**2.00** «Не можа быць!»
**3.00** Серыял «Нанакаханне».
**4.00** Серыял «Амазонкі».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.40** Навіны культуры.
**10.15, 1.55** «Назіральнік».
**11.15** «Дробязі жыцця». Маст. фільм.
**12.25** «Барыс Чарток. 100 гадоў: тангаж у норме». Дак. фільм.
**13.05, 20.45** «Правілы жыцця».
**13.35** «Пятае вымярэнне».
**14.00** 95 гадоў з дня нараджэння Юрыя Лотмана. «Пушкін і яго акружэнне». Частка 1-я.
**15.10** Анёлы і дэманы Марлен Дзітрых. «Д'ябал — гэта жанчына». Маст. фільм.
**16.40, 22.00** «Метраном. Гісторыя Парыжа». Дак. серыял.
**17.30** «Не кватэра — музей». Мемарыяльны музей-кватэра В.В. Набокава.
**17.45** Да 70-годдзя Гідана Крэмера. «Танга сенсацый». Творы А. П'яцолы.
**18.30** Сусветныя скарбы.
**18.45** Сучаснае — мінулае. «Зняволены камеры №207». Дак. фільм.
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** Штучны адбор.
**21.15** «Гульня ў бісер». «Яўген Еўтушэнка. Лірыка».
**22.50** 95 гадоў з дня нараджэння Юрыя Лотмана. «Прастора Юрыя Лотмана». Дак. фільм.
**23.55** Мастсавет.
**0.00** Анёлы і дэманы Марлен Дзітрых. «Дэстры зноў у сядле». Маст. фільм.
**1.35** Ігрaе Фрэдэрык Кемпф.

### Настальгія

**6.00** «Акулы пяра». Мікалай Растаргуеў.***
**6.40, 8.05, 9.30, 11.15, 12.55, 14.30, 15.40, 17.00, 21.40, 23.00, 23.40, 5.15** Музычная настальгія.*
**7.00** «Народжаныя ў СССР». Найлепшае. 2006 год.***
**8.25** Дак. фільм «Не ў адзін дзень Масква будавалася».***
**9.00** «Рок-н-рол ТБ». 1992 год.***
**10.00** Маст. фільм «Вежа».***
**11.45, 5.45** «Сядзі і глядзі». Музычна-парадыйная праграма. 1994 год.***
**12.00** The Best of «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым. 2006 год.****
**13.20** Маст. фільм «Збягаючы жнівень».***
**15.00, 21.00** «Мінулы час».*
**16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР».*
**18.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Іншае жыццё: МПЗ». 2007 год.***
**18.55** Фільм-спектакль «Варшаўская мелодыя». Па п'есе Л. Зорына.***
**23.20** «Час пік». 1995 год.***
**0.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1974. 2-я частка. 2011 год.***
**1.00** Маст. фільм «Кантрабанда».***
**2.25** «Ранішняя пошта». 1989 год.*
**3.00** «Быў час». 2009 год.***
**4.00** Маст. фільм «Штэпсель жэніць Тарапуньку».***

### EuroSport 1

**3.00** Футбол. «ФІФА».
**3.30, 7.30, 9.00, 16.00, 22.00** Скачкі з трампліна. Чэмпіянат свету.
**5.00, 1.00** Супербайк. Этап чэмпіянату свету.
**5.30** Веласпорт. Кюрнэ — Брусель — Кюрнэ.
**6.30, 13.15, 18.45, 23.00, 2.30** Лыжныя гонкі. Чэмпіянат свету.
**12.00** Лыжнае дваябор'е. Чэмпіянат свету.
**19.30** Конны спорт. Кубак свету.
**21.30** «Найлепшае з коннага спорту».
**0.00** Веласпорт. Кюрнэ — Брусель — Кюрнэ.

### Кінакамедыя

**0.40** Камедыя «Кухня ў Парыжы».***
**2.35** Камедыя «Піўная ліга».***
**4.00** «Камедыянты (Шоу)».***
**4.30, 14.00, 14.50, 15.40** Скетчкам «Паміж намі».***
**4.50** Камедыя «Доля анёлау».*
**6.40** Меладрама «10 дзён каб закахацца».***
**8.20** Камедыя «Міс Пецігру жыве сённяшнім днём».***
**10.00** Камедыя «Развод паітальянску».*
**11.55** Прыгоды «Вакол свету за 80 дзён».*
**14.20, 15.10** «Камедыянты (Шоу)».***
**16.00** Камедыя «Стары новы дом».*
**17.40** Камедыя «Нявеста любой цаной».****
**19.30** Камедыя «Крануты».***
**21.30** Камедыя «Галівудскі фінал».*
**23.35** Меладрама «Заручаныя асуджаныя».***

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.40, 14.50** «Ёсць адзін сакрэт».
**8.05** «Доктар I...»
**8.35, 19.10, 3.05** «20 хвілін». Серыял.
**10.00, 4.30** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**11.45** «Знахаркі».
**12.45** «Варажбітка».
**13.50** «Паралельны свет».
**15.20** «Здзелка».
**15.55** «Натуральны адбор».
**16.50, 21.55** «Рэвізора».
**18.10** «Тайны следства». Серыял.
**20.55, 2.10** «Ведзьмакі свету».
**23.00** «Гісторыі выратавання».
**23.35** «Звышнатуральнае». Серыял.
**0.20** «Рэд 2». Камедыя.*

### ТБ1000

**6.10, 18.20** Не здавайся.***
**8.05** Баец.***
**10.15** Версальскі раман.****
**12.25** Неверагодная падарожжа містара Співета.*
**14.20** Няпрошаныя госці.***
**16.30** Хутчэй за кулю.****
**20.10** Сем'янін.***
**22.30** Залаты компас.*
**0.35** Настаўнік на замену.***
**2.20** Салодкі лістапад.*
**4.20** Кіраванне гневам.*

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20, 22.30** Тры таварышы.***
**8.20** Зусім не простая гісторыя.***
**10.20** Жыць.***
**12.35** Брыльянты для дыктатуры пралетарыяту. Серыя 2.***
**14.10** Брат 2.***
**16.40** Неваляшка.*
**18.40** Няўлоўныя: апошні герой.***
**20.20** Самы лепшы дзень.***
**0.30** Экспіріенс.***
**2.10** Бывайце, доктар Фрэйд!*
**4.30** Кампенсацыя.***

### National Geographic

**6.00, 13.15, 20.15** Гульні розуму.*
**6.45, 21.00, 0.55, 4.15** Навуковыя недарэчнасці.*
**7.35, 10.55, 14.50** Мегазаводы.*
**8.25, 15.35** Міжнародны аэрапорт Дубай.*
**9.15** Антарктыка.*
**10.05, 22.40, 1.50** Сакрэтныя матэрыялы старажытнасці.***
**11.45, 16.20, 19.25, 23.25, 2.35** Расследаванні авіякатастроф.***
**12.30** Навука будучыні.*
**17.55** Непакорныя акіяны.***
**18.40, 21.50, 5.10** Сапраўдны геній.*

### Discovery

**8.00, 14.00, 0.00, 3.50** Залатая ліхаманка.*
**9.30, 15.00, 21.00, 5.30** Як гэта зроблена?*
**10.00, 16.00** Паляўнічыя на рэліквіі.*
**10.30, 16.30, 23.30, 7.35** Паляўнічыя на складзе.***
**11.00** Страсць да матораў.*
**17.00, 22.00, 2.55** Махінатары.*
**19.00** Браты Дызель.***
**20.00** Хуткія і гучныя.*
**23.00, 7.10** Склады.*
**1.00, 6.20** Не спрабуйце паўтарыць.***
**2.00, 4.40** Маланкавыя катастрофы.***




## КАМАШЫ НА ЎСЕ СТО

**Штотыдзень у эфіры тэлеканала «Беларусь 3» тэлевіктарына «Размаўляем па-беларуску». Для таго, каб стаць яе ўдзельнікамі, неабходна зайсці на сайт tvrgomel.by або 3belarus.by і праз банер «Размаўляем па-беларуску» запоўніць заяўку на каманду з трох чалавек. Ну, а праверыць сваё веданне роднай мовы пасля таго, як праграма выйшла ў эфір, можна з дапамогай «Звязды». Ці ведалі вы, што:**

**Віяду́к** — мост над ярам, цяснінай, дарогай.

**Кама́ш** — мужчынскі чаравік з гумавымі ўстаўкамі.

**Летуце́ць** — аддавацца марам, марыць.

**Пу́дзіць** — страшыць, пужаць.

**Адры́на** — халодная будыніна для захоўвання кармоў.

**Угодкі** — урачыстасць, прысвечаная гадавіне якой-небудзь падзеі.

**Ставіць падножку** — рабіць каму-небудзь непрыемнасць, шкодзіць. Беларускія адпаведнікі: заступаць дарогу, псаваць абедню. Рускі: ставить палки в колёса.

**На ўсе сто** — 1) у поўнай меры; 2) вельмі добра, цудоўна; 3) вельмі добры, цудоўны. Беларусы яшчэ скажуць: дай Бог кожнаму, любадорага, на дзіва, за маё-маё, кругом сто двацаць, пашукаць такога, разлюлі маліна. Рускія: на славу, пальчики оближешь, на отлично.

***Чарговыя выпускі тэлевіктарыны глядзіце ў эфіры «Беларусь 3» раніцай кожную суботу.***

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
iost@zviazda.by

## ■ Тэлесеткі

## На «Беларусь 1» перабралі «Каробку перадач»

**Папулярны тэлепраект, які ўжо больш як 5 гадоў дапамагае аўтааматарам лепш зразумець і наладзіць стасункі з іншымі вадзіцелямі, ДАІ, пешаходамі і ўласнымі машынамі, абнавіў фармат.**




Так, у новым тэлесезоне склад вядучых — экспертаў праграмы папоўнілі Павел Казлоўскі, журналіст і аўтааматар са стажам, які з поўным веданнем справы выпрабоўвае розныя маркі аўто ў рубрыцы «Тэст-драйв», і Уладзіслаў Радзюкоў — вопытны вадзіцель і смелы выпрабавальнік рубрыкі «Эксперымент», дзе машыны тушаць, утылізуюць, выстаўляюць супраць эвакуатара і г.д.

Акрамя таго, «Каробка перадач» па-ранейшаму кожную нядзелю адказвае на пытанні гледачоў з дапамогай інспектара ДАІ, дае карысныя парады па выбары, рамонце і доглядзе аўто, знаёміць аўдыторыю з незвычайнымі ўзорамі аўта- і мотатэхнікі... «У новым сезоне сумна дакладна не будзе як пачаткоўцам са стажам, так і тым, хто толькі збіраецца атрымаць правы», — запэўніваюць стваральнікі праграмы.

**Вікторыя ЗАХАРАВА** ■

## наступны тыдзень



**ШАЛІ.** Надыходзіць спрыяльны час для кар'ернага росту. Вам неабходна заявіць пра сябе, хай і не занадта гучна і агрэсіўна, але ўсё ж настойліва, паказаць сваю пазіцыю, тады вы зможаце разлічваць на спрыяльнае вырашэнне сітуацыі. У пачатку тыдня набярыцеся цярпення, бо калегі па рабоце і блізкія людзі могуць тузаць вас па ўсякіх дробязях. Бліжэй да выхадных займіцеся планаваннем вечарынкі з сябрамі або невялікага падарожжа з каханым чалавекам



**СКАРПІЁН.** Тыдзень будзе спрыяльны для працы, рэалізацыі сваіх амбіцый, для ўсіх дзелавых і прадпрымальных людзей. Тое, што здавалася складанай праблемай, вырашыцца на вашу карысць, прычым само сабой. Вам можа паступіць цікавая прапанова, не адмаўляйцеся: яна абяцае вялікія перспектывы і прыбытак. На рахунак паступіць вялікая сума. Ваша праца будзе аплачана і адзначана вельмі высока.



**СТРАЛЕЦ.** На гэтым тыдні вам неабходна будзе засяроджаца на галоўным і не марнаваць сілы на рашэнне другарадных праблем. Зараз зручны час, каб з усёй сур'ёзнасцю задумацца пра будучыню і прыняць важнае рашэнне. Вам варта паменш слухаць навакольных і больш самога сябе. У вашых руках дамагчыся пастаўленых мэт, але для гэтага трэба сабрацца з сіламі і перастаць таптацца на месцы. Пажадана, каб рост вашай актыўнасці і прадпрымальнасці не ператвараўся ў імітацыю бурнай дзейнасці. Вы зможаце ў поўнай меры задзейнічаць усе сувязі, але перш за ўсё папрацаваць давядзецца вам. Да серады пажадана не пачынаць новых спраў.



**КАЗЯРОГ.** Вам неабходна ўмацоўваць свой аўтарытэт і берагчы сваю рэпутацыю. Не варта ва ўсім пагаджацца з начальствам або з каханым чалавекам. У вас павінна быць і сваё меркаванне. Перад вамі адкрываецца мноства варыянтаў, шляхоў, па якіх вы можаце прайсці, але далёка не ўсе з іх на самай справе рэальныя. У сераду будзе неабходна разабрацца з незавершанымі папяровымі справамі, не адпраўляйце іх у доўгую скрыню. У чацвер або пятніцу не спрабуйце нікому навязваць сваё меркаванне. У нядзелю давядзецца заняцца назапашанымі праблемамі падрастаючага пакалення.



**ВАДАЛЕЙ.** Тыдзень абяцае быць не сумным, хоць і няпростым. Магчымыя змены ў лепшы бок у адносінах з дзелавымі партнёрамі, а разумны кампраміс падчас перамоваў дазволіць дамагчыся вызначаных мэты. Будзьце асцярожныя пры зносінах з афіцыйнымі асобамі. Не ўсе вашы выказванні прыйдуцца даспадобы, што можа ўнесці рознагалоссі ў жыццё калектыву і стаць прычынай для непаразумення. Пятніца — спрыяльны дзень для пачатку падарожжаў. І ні ў якім разе не пераносьце намечаны адпачынак.



**РЫБЫ.** Найвышэйшую каштоўнасць на гэтым тыдні набудуць вашы бескарыслівасць і чыстата намераў. Вам трэба нічога не атрымаецца зрабіць для сябе, аднак дзеянні альтруісцкага характару будуць мець ашаламляльны поспех. У аўторак варта як мага менш трапляцца на вочы начальству, інакш вам дадуць заданне, якое можа перашкодзіць паўнавартасна адпачыць у выхадныя. Серада — прыдатны дзень для навядзення парадку, як у справах, так і ў думках.

## Чацвер, 2 сакавіка

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.20** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.45** Зона Х.
**9.10, 22.10 Серыял «След».***
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00, 20.00 Серыял «Практыка».***
**12.10, 16.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».***
**13.20** Дзень у вялікім горадзе.
**14.20** Дзіцячы доктар.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «Закаханыя жанчыны».***
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20, 0.05** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.40** Буйным планам.
**0.35** Дзень спорту.
**0.50 Серыял «Другое паўстанне Спартака».***

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 22.30** Тэлебарометр.
**9.05, 18.45 Серыял «Апошні з Магікян».***
**10.10, 17.20 Дэтэктыў «Такая работа».***
**11.00, 16.30 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».***
**11.50, 22.40 Серыял «Шурачка». Заключная серыя.***
**12.25, 19.45** «Тата папаў». Сямейнае рэаліці-шоу.
**14.15, 21.30, 22.05** «Паненкасялянка». Рэаліці-шоу.
**15.20, 23.15** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**16.05, 23.55** «Анлайн. Па-за сеткай». Скетчкам.
**18.10** «Пра ежу».
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНО.

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35** «Беларуская кухня». Рыбны квас.
**8.00, 12.00, 20.20** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 18.40 «Ясенін». Драма.***
**9.15, 13.35 «Смерць веласіпедыста». Драма.***
**10.45** «Гітара па крузе».
**11.40** М/ф.0
**12.15** «Наперад у мінулае».
**12.40, 0.45** «Дыя@блог». Пра літаратуру.
**13.05** «Святло далёкай зоркі». Памяці мастака-пастаноўшчыка Юрыя Тура.
**15.00, 21.05 «Ваенная контрразведка. Наша перамога». «Аперацыя «След».***
**15.40, 21.45 «Блакада». Драма. Фільм першы.***
**19.35** «Музеі Беларусі». Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь.
**20.00** «Тэатр у дэталях». Спектакль Тэатра-студыі кінаакцёра «Механічны чалавек».
**20.40** «Калыханка».

### Беларусь 5

**7.55** Слэм-данк.
**8.20** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**8.50** Гандбол. SEHA-Газпрам ліга. «Гарэнье» (Славенія) — БГК імя Мяшкова (Беларусь).
**10.15** Хакей. КХЛ. Заходняя канферэнцыя. 1/4 фіналу. Пяты матч. «Лакаматыў» — «Дынама-Мінск».
**12.10** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 1/16 фіналу. Матч у адказ.
**14.05, 21.40** Біятлон. Этап Кубка свету. Пхенчхан. Спрынт. Жанчыны.
**15.30** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 1/16 фіналу. Першыя матчы. Агляд.
**16.25** На шляху да ЧС-2018. Відэачасопіс.
**16.50** Хакей. КХЛ. Усходняя канферэнцыя. 1/4 фіналу. Пяты матч. (У перапынках — PRO спорт. Навіны.)
**19.20** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. 1/4 фіналу. Чацвёрты матч. (У перапынках — PRO спорт. Навіны.)
**23.10** Авертайм.

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!»
**10.20** «Смак».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.10** «Сам-насам з усімі».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.15, 16.20** «Час пакажа».
**16.55** «Давай пажэнімся!»
**18.20 Серыял «Татавы дочкі».**
**18.55** «Няхай гаворыць».
**20.00** Час.
**21.05** «Трэба разабрацца».
**21.30 Серыял «Грачанка».**
**23.25 Маст. фільм «Я ведаю, што ты ведаеш».***
**0.40** «Вячэрні Ургант».
**1.20** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.25** «Тайны Чапман».
**9.25** «Усім па катку».
**9.35, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**10.45, 0.15 «Знахар». Серыял.**
**12.35, 17.35** «Званая вячэра».
**13.50** «Сакрэтныя тэрыторыі».

**15.40 «Следакі». Серыял.**
**16.10** «Скардзіцца дазваляецца».
**16.50** «Мінск і мінчане».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Дзіўная справа».
**22.00** «Глядзець усім!»
**23.05** «Аўтапанарама».

### МІР

**6.05** М/ф.0
**7.30** Добрай раніцы, свет!*
**9.00, 23.50 Маст. фільм «Родная кроў».***
**12.30** «Цяжар абеду».*
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** «Няма праблем!»***
**14.55** Дак. фільм «Сямейныя драмы».***
**16.15 Серыял «Вяртанне Мухтара-2».***
**19.20, 2.55 Серыял «Закон і парадак».***
**22.10 Маст. фільм «Жаночы дзень».***
**5.15 М/ф «Маша і Мядзведзь».0**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Пакой смеху».
**12.00** «60 хвілін». Ток-шоу.
**13.15** «Правілы жыцця».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.40** «Прамы эфір».
**17.20 Серыял «Веранiка. Страчанае шчасце».**
**19.15, 20.40 Серыял «Пошукі доказаў».**
**21.40** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**22.00, 23.10 Серыял «Кацярына. Узлёт».**
**0.05** «Паядынак».

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.

**6.10** «Таямнічая Расія».***
**7.10, 8.05 Серыял «Адвакат».***
**9.00 Серыял «Вяртанне Мухтара».***
**9.45, 23.10** «НЗ.by».
**10.25 Серыял «Пчаляр».***
**12.00** Суд прысяжных.
**13.25, 16.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05 Серыял «Патруль».***
**17.00 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».***
**18.00** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.40 Серыял «Сэрца анёла».***
**21.30 Серыял «Настаўнік у законе. Схватка».***
**23.30** «Рэвалюцыя live».

### 8 канал

**7.00** Раніца на «Восьмым».
**11.00 Трылер «Разлом Сан-Андрэас».**



**12.50** Дак. серыял «Кошак не любіць нельга».
**13.40 Драма «Падмена».**
**15.55, 19.25, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**16.00 «Мультпарад». «Зямля да пачатку часоў».**
**17.00** «Мой любімы гадавалец».
**17.30 Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».**
**18.15 Серыял «Канвой «PQ-17».**
**19.10** «Фэшн is my прафэшн».
**19.30 Серыял «Выкрадзеныя».**
**20.50** «Вечарніца». «Кацяня па імені Гаў».
**21.05** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.15 Баявік «Жывеш толькі двойчы».**
**23.15 Серыял «Амерыканская гісторыя жахаў».**

---

### ВТБ

**6.00** «Турбаміксер».
**7.00** М/ф «Тры каты».
**7.05** М/ф «Смяшарыкі».
**7.35** М/ф «Маша і Мядзведзь».
**7.45** М/ф «Машыны казкі».
**7.50** М/ф «Фіксікі».
**8.00** «Ералаш».
**8.30, 16.50** Серыял «Варонiны».
**9.30** Камедыя «Starперцы».
**11.40** Скетч-шоу «6 кадраў».
**12.00, 5.00** Серыял «Сакратар».
**13.00** «Паспець за 24 гадзіны».
**14.00, 19.20** Серыял «Мамачкі».
**15.00, 00.50** Серыял «Маладзёжка».
**16.20** Серыял «Сям'я 3D».
**18.00, 23.30** «Уральскія пельмені».
**20.20** Серыял «Закрытая школа».
**21.30** Камедыя «Уладар ежы».
**0.00** Еўрапейскі покерны турнір.
**2.00** «Не можа быць!»
**3.00** Серыял «Нанакахане».
**4.00** Серыял «Амазонкі».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.40** Навіны культуры.
**10.15, 1.55** «Назіральнік».
**11.15** «Сваё шчасце». Маст. фільм.
**12.25** «Зорка з боку. Рахіль Месерэр». Дак. фільм.
**13.05, 20.45** «Правілы жыцця».
**13.35** «Расія, любоў мая!» «Звычаі і традыцыі эрзі».
**14.00** Да 95-годдзя з дня нараджэння Юрыя Лотмана. «Пушкін і яго акружэнне».
**15.10** Анёлы і дэманы Марлен Дзітрых. «Нью-Арлеанская каханая». Маст. фільм.
**16.40, 22.00** «Метраном. Гісторыя Парыжа». Дак. серыял.
**17.30** «Не кватэра — музей». Музей-сядзіба І.Я. Рэпіна «Пенаты».
**17.45** Да 70-годдзя Гідана Крэмера. Канцэрт Гідана Крэмера і Ансамбля салістаў Маскоўскай дзяржаўнай філармоніі.
**18.45** Да 85-годдзя Георгія Штыля. «Вышыня». Дак. фільм.
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
**21.15** «Культурная рэвалюцыя».
**22.55** 70 гадоў з дня нараджэння Юрыя Багатырова. «Астравы».
**23.55** Мастсавет.
**0.00** Анёлы і дэманы Марлен Дзітрых. «Замежны раман». Маст. фільм.

### Настальгія

**6.00** «Быў час» з Аляксандрам Палiтkоўскім: «Іншае жыццё: МПЗ». 2007 год.***
**6.55** Фільм-спектакль «Варшаўская мелодыя». Па п'есе Л. Зорына.***
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час».*
**9.40, 11.00, 11.40, 14.05, 15.40, 17.00, 21.40, 0.55, 2.30, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.*
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».*
**11.20** «Час пік». 1995 год.***
**12.00** «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. 2007 год.***
**13.00** «Пра ката...» Маст. фільм.***
**14.30** Маст. фільм «Пары».***
**18.00** «Эліта Краіны Саветаў». Мікалай Дупак. 2007 год.**
**18.55** Маст. фільм «Прыгажун-мужчына».***
**23.00** «Песня-77».*
**0.00** The Best of «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым. 2006 год.****
**1.20** Маст. фільм «Збягаючы жнівень».***

### EuroSport 1

**3.30, 7.00, 10.30, 13.00, 18.15, 1.00** Скачкі з трампліна. Чэмпіянат свету.
**4.30, 6.30, 9.00, 11.30** Лыжнае дваябор'е. Чэмпіянат свету.
**5.30, 9.30, 15.30, 21.15, 0.00, 2.30** Лыжныя гонкі. Чэмпіянат свету.
**14.00, 17.15** Біятлон. Кубак свету.
**22.00** «Зала Славы». Ванкувер-2010.
**23.00** «Зала Славы». Турын-2006.

### Кінакамедыя

**0.35** Меладрама «10 дзён каб закахацца».***
**2.20** Камедыя «Шэф».*
**4.00** Камедыя «Кухня ў Парыжы».***
**05.55** Прыгоды «Вакол свету за 80 дзён *
**8.00** Камедыя «Развод паітальянску».*
**9.55** Камедыя «Кранутыя».***
**11.55** Камедыя «Галівудскі фінал».*
**14.00, 14.50, 15.40** Скетчкам «Паміж намі».***
**14.20, 15.10** «Камедыянты (Шоу)».***
**16.00** Камедыя «М + Ж».***
**17.30** Дэтэктыў «Піражкі з бульбай».*
**19.30** Меладрама «Дапамажыце стаць бацькам».***
**21.15** Камедыя «9 месяцаў строгага рэжыму».***
**22.45** Камедыя «Асаблівасці нацыянальнага палявання».***

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.50, 15.05** «Ёсць адзін сакрэт».
**8.15** «Доктар І...»
**8.45, 19.10, 2.35** «20 хвілін». Серыял.
**10.20, 4.00** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**12.05** «Знахаркі».
**13.00** «Варажбітка».
**14.05** «Паралельны свет».
**15.35** «Здзелка».
**16.05** «Натуральны адбор».
**17.05 ,21.55** «Рэвізора».
**18.10** «Тайны следства». Серыял.
**21.00** «У майго дзіцяці шостае пачуццё».
**23.15, 5.30** «Вокладка».
**23.45** «Звышнатуральнае». Серыял.
**0.30** «Фарсаж 6». Баявік.*

### ТБ1000

**6.10, 18.00** Настаўнік на замену.***
**8.20** Перакладчыца.*
**11.00** Кастрычніцкае неба.*
**13.20** Незвычайныя прыгоды Адэль.*
**15.35** Гульня ў імітацыю.***
**20.10** Трэцяя персона.***
**22.50** Гладыятар.*
**1.50** Версальскі раман.****
**4.00** Баец.***

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Блукаючыя.*
**8.10** Бяжы! Серыя 1.***
**10.10** Тры дзяўчыны.***
**12.05** Дзесяць негрыцянят.*
**14.40** Са мною вось што адбываецца.***
**16.20** Рэальны тата.*
**18.15** Лейтэнант.*
**20.20** Бяжы! Серыя 2.***
**22.20** Сатысфакцыя.***
**0.20** Каўказская рулетка.***
**2.10** Зусім не простая гісторыя.***
**4.20** Тры таварышы. Серыя 1—2.***

### National Geographic

**6.00, 13.15, 20.15** Гульні розуму.*
**6.50, 5.35** Навуковыя недарэчнасці.*
**7.40, 10.55, 14.50** Мегазаводы.*
**8.30, 15.40** Міжнародны аэрапорт Дубай.*
**9.20, 17.55** Золата Юкана.*
**10.05, 22.30** Сакрэтныя матэрыялы старажытнасці.***
**11.45, 16.25, 19.25, 21.00, 23.15, 2.25** Расследаванні авіякатастроф.***
**12.30** Космас: прастора і час.*
**18.40, 21.45, 1.35, 4.50** Сапраўдны геній.*

### Discovery

**8.00, 14.00, 19.00, 0.00, 3.50** Залатая ліхаманка.***
**9.00, 15.30, 21.40, 5.55** Як гэта ўстроена?*
**9.30, 15.00, 21.00, 5.30** Як гэта зроблена?*
**10.00, 16.00, 23.00, 7.10** Склады.*
**10.30, 16.30, 23.30, 7.35** Бітва за нерухомасць.*
**11.00** Пяцёрка найлепшых.*
**17.00, 22.00, 2.55** Махінатары.*
**18.00** Забытая інжынерыя.***
**20.00** Выжыць у дзікіх умовах.*
**1.00, 6.20** Не спрабуйце паўтарыць.***
**2.00, 4.40** Маланкавыя катастрофы.***

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск №12

Сёлета споўнілася б 90 гадоў вядомаму беларускаму шахматнаму кампазітару Сцяпану Цыруліку (1927—1997). Сцяпан Паўлавіч жыў у Дзятлаўскім раёне, працаваў аграномам. Склаў звыш за 800 задач, з іх 250 былі адзначаны ў конкурсах (у тым ліку 50 першымі і 47 іншымі прызамі). Неаднаразовы чэмпіён Беларусі ў асабістым і камандным заліку, двухразовы чэмпіён СССР у складзе каманды БССР, майстар спорту.

Наступная задача аўтара ўвайшла ў залаты фонд айчыннай шахматнай кампазіцыі.

**Белыя:** Крс2, Ла5, Лс6, Сс4, Cf6, Kd5, Kf7, п. f3 (8).

**Чорныя:** Kpf5, Фd6, Лd8, Cf8, пп. f2, g7, h7 (7).

Мат у 2 хады.

Рашае 1.Cg5! (пагроза 2.Ke7x) Фe5 2.Ke3x, 1...Ф:d5 2.Cd3x, 1... Фс5 2.Ke3x, 1...Kpg6 2.Kf4x, 1...Kpe6 2.Kb6x. Чорны ферзь самазвязваецца ў пяці варыянтах.

Для рашэння прапануем яшчэ адну задачу Сцяпана Цырульіка *(гл. дыяграму).*



**Белыя:** Kpa1, Фg2, Cd6, Ka3, Ke1, пп. c2, d2, f4 (8).

**Чорныя:** Kpd4, Лс8, Cd3, Kf2, пп. d5, e5 (6).

Мат у 2 хады.

Дасылайце рашэнні на адрас рэдакцыі («Звязда», вул. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

Фінішавала першынство Беларусі сярод шахматыстаў да 18 гадоў. У юнакоў (33 удзельнікі) прызавую тройку склалі майстар ФІДЭ Вячаслаў Зарубіцкі (Орша), Максім Іваннікаў (Гомель) і Станіслаў Кавалеўскі (Мінск), у дзяўчат (19 удзельніц) — Вольга Бадэлька (Магілёў), Яна Ільючык (Кобрын) і Ксенія Зелянцова (Бабруйск). А вось як гулялі пераможцы.

Вячаслаў Зарубіцкі — Цімафей Клачкоў. 1.e4 c5 2.Kf3 Kc6 3.Cb5 g6 4.0-0 Cg7 5.c3 Kf6 6.Ле1 0-0 7.h3 Фb6 8.Ca4 d5 9.e5 Ke8 10.d4 cd 11.cd Kc7 12.Kc3 f6 13.C:c6 Ф:c6 14.Cf4 g5 15.ef gf 16.fg Kp:g7 17.Л:e7+ Kph8 18.Фe2, 1:0.

Ганна Старавойтава — Вольга Бадэлька. 1.e4 c5 2.c3 Kf6 3.e5 Kd5 4.g3 e6 5.Cg2 d6 6.ed C:d6 7.Kf3 0-0 8.0-0 Kc6 9.d4 Cd7 10.Ka3 cd 11.Kb5 Ce7 12.Kb:d4 Cf6 13.Kb3 Фc7 14.Cg5 C:g5 15.K:g5 h6 16.Kf3 Лad8 17.Фe2 e5 18.Лfe1 Лfe8 19.Kfd2 Kf6 20.Ke4 K:e4 21.Ф:e4 f5 22.Фe2 e4 23.Фh5 Ле5 24.Фe2 Лf8 25.Kd2 Лee8 26.Kc4 b5 27.Ke3 Ke5 28.Kd5 Фc5 29.Kf4 g5 30.Kh3 f4 31.Ф:e4 C:h3 32.b4 C:g2 33.Kp:g2 Фc4 34.Фc2 Фc6+, 0:1.

* * *

У сталіцы Ірана праходзіць чарговы жаночы чэмпіянат свету. Шэраг шахматыстак з розных краін адмовіліся ехаць у Тэгеран па палітычных або этычных меркаваннях (з-за абавязковага нашэння хусткі і г. д.). Сярод 64 удзельніц адзіная прадстаўніца Беларусі была гросмайстар Настасся Зязюлькіна. На першым этапе яна саступіла экс-чэмпіёнцы свету Ганне Ушэніная (Украіна) з лікам 0,5:1,5 і выбыла з далейшай барацьбы.

Уладзіслаў Кавалёў заняў шостае месца з 167 удзельнікаў на турніры ў Лісабоне, а па хуткіх шахматах (143 удзельнікі) быў тут першым. Кірыл Ступак выйграў турнір у Францыі (45 удзельнікаў), а Мікіта Маёраў заняў 10-е месца.

* * *

Рашэнне задачы з мінулага выпуску: 1.Фe6 Kpf8 2.Фg6 d3 3.Cd2 e6 4.Cb4x, 1...d3 2.Cd2 Kpf8 3.Фg6 e6 4.Cb4x, 2...Kpd8 3.Фc6 e6 4.Cg5x.

**Вадзім ЖЫЛКО.**

## Пятніца, 3 сакавіка

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 1.45** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.20** Зона Х.
**9.10 Серыял «След».*****
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00, 20.00 Серыял «Практыка».***
**12.10, 17.40 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».*****
**13.20** Дзень у вялікім горадзе.
**14.20** Дзіцячы доктар.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «Закаханыя жанчыны».*****
**21.00** Панарама.
**21.40** Жанчыны і спорт.
**22.10 Меладрама «Прысуд ідэальнай пары».*****
**2.00** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 23.35** Тэлебарометр.
**9.05, 18.45 Серыял «Апошні з Магікян».*****
**10.10, 17.20 Дэтэктыў «Такая работа».*****
**11.00, 16.30 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».***
**11.55** Нас не падманеш.
**12.30, 19.50** «Тата папаў». Сямейнае рэаліці-шоу.
**14.10** «Паненка-сялянка». Рэаліці-шоу.
**15.20** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**16.05** «Анлайн. Па-за сеткай». Скетчкам.
**18.10** «Пра ежу».
**21.25, 22.05** «Бітва экстрасэнсаў. 14-ы сезон».
**22.00** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**23.40 Драма «У дзікіх умовах».*****

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35** «Беларуская кухня». Локшыны.
**8.00, 12.00, 20.20** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 18.40 «Ясенін». Драма.*****
**9.10 «Рэпетыцыя аркестра». Камедыя.**
**10.20** «Гітара па крузе».
**11.10** «Святло далёкай зоркі». Памяці акцёра і рэжысёра Валерыя Маслюка.
**11.35** «Навукаманія».
**12.15** «Наперад у мінулае».
**12.40** «Сіла веры».
**13.10 «Прыгоды Бураціна». Казка.**
**15.20, 21.05** «Ваенная контрразведка. Наша перамога». «Аперацыя «Вервольф».*
**15.55, 21.40 «Блакада». Драма. Фільм другі.***
**19.35** «Музеі Беларусі». Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь.
**20.00** «Тэатр у дэталях». Спектакль «Пінская шляхта». Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы.
**20.40** «Калыханка».

### Беларусь 5

**7.35** Авертайм.
**8.00** Хакей. КХЛ. Усходняя канферэнцыя. 1/4 фіналу. Пяты матч.
**10.00** Біятлон. Этап Кубка свету. Пхенчхан. Спрынт. Жанчыны.
**11.30, 14.20, 18.30, 21.45** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы ў памяшканні.
**12.50, 23.20** Біятлон. Этап Кубка свету. Пхенчхан. Спрынт. Мужчыны.
**18.00** Піт-стоп.
**19.20** Хакей. КХЛ. Заходняя канферэнцыя. 1/4 фіналу. Шосты матч. «Дынама-Мінск» — «Лакаматыў». (У перапынках — PRO спорт. Навіны.)

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!»
**10.20** «Смак».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.20** «Адваротны адлік». «Горад на Нямізе. У пошуках страчанага».
**13.10** «Сам-насам з усімі».
**14.15** «Час пакажа».
**16.20 Маст. фільм «Нечаканa-негадана».***
**18.20 Серыял «Татавы дочкі».**
**19.00** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**21.05** «Голас. Дзеці». Новы сезон.
**22.50 Маст. фільм «Як выйсці замуж за мільярдэра».***



**0.30** «Вячэрні Ургант».
**1.10** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.05** «Тайны Чапман».
**9.25** «Далёкія сваякі».
**9.40, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**10.45, 23.55 «Знахар». Серыял.**
**12.35, 17.35** «Званая вячэра».
**13.50** «Дзіўная справа».
**15.35** «Следакі». Серыял.
**16.50** «Аўтапанарама».
**17.10** «Адкрытая размова».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Бітва за космас: пачатак зорных войнаў».
